№№60–61
(3190–3191)

20—22 красавіка 2010 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

*На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...*
Якуб КОЛАС

Народная Воля

Жадаючых прадаваць газету "Народная Воля" просім тэлефанаваць у рэдакцыю:
8-017-328-68-71 (прыёмная), 8-017-328-63-93.

Сярэдняя працягласць жыцця ў Беларусі мужчын — 62 гады, жанчын — 76—77 гадоў. У развітых краінах мужчыны жывуць у сярэднім 76—78 і больш гадоў, а сярэдняя працягласць жыцця жанчын набліжаецца да 85 гадоў. Чаму ў Беларусі рана паміраюць людзі?

Ці не гэта галоўнае пытанне дня як для прэзідэнта, яго ўрада, так і для ўсяго беларускага грамадства?

АКЦЫЯ

«Чарнобыльскі Шлях» будзе

Арганізатары "Чарнобыльскага Шляху — 2010", які запланаваны на 26 красавіка, згодны на кампрамісны варыянт яго правядзення. Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі ў Мінску лідэр міжнароднай арганізацыі "Малады фронт" (Чэхія) Дзмітрый Дашкевіч.

У заяўцы, перададзенай у Мінгарвыканкам, у якасці маршруту шэсця значыцца праспект Незалежнасці. Дэманстранты плануюць сабрацца ў 18.00 на пляцоўцы каля будынка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і прайсці да Кастрычніцкай плошчы сталіцы, каб правесці там мітынг.

"Сваёй заяўкай мы прадэманстравалі, што "Чарнобыльскі Шлях" павінен праходзіць у цэнтры горада, — сказаў Дашкевіч. — *Але мы разумеем, што ўлады наўрад ці пагодзяцца з такім маршрутам".* Арганізатары, паводле яго слоў, вырашылі "не абвастраць сітуацыю" і пагадзіцца з любым маршрутам, прапанаваным уладамі, у тым ліку да Чарнобыльскай капліцы каля плошчы Бангалор.

Дашкевіч адзначыў, што мерапрыемства будзе жалобным. *"Чарнобыльскі Шлях" — гэта не свята, таму барабаны, феерверкі на ім недарэчныя. Прапаганду, напрыклад, анархісцкіх поглядаў мы будзем расцэньваць як правакацыю",* — сказаў ён.

Тым часам Партыя БНФ ужо заявіла, што адмаўляецца ад удзелу ў арганізацыі мерапрыемства. Маўляў, для ўшанавання ахвяр Чарнобыля патрэбен новы фармат...

Сяргей КАРАЛЕВІЧ, БелаПАН.

Сёння краіна пачуе штогадовае пасланне прэзідэнта свайму народу

20 красавіка кіраўнік дзяржавы звернецца з традыцыйным штогадовым пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу.

Дзеля гэтай мэты збіраецца сумеснае пасяджэнне Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі. Прамая трансляцыя пачнецца ў 12.00 па Першым канале Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, тэлеканалах АНТ і СТБ, Першым нацыянальным канале беларускага радыё.

ДАСЛОЎНА

Аляксандр Лукашэнка: «Мы гатовы прыняць Бакіева ў Беларусі — гэта маё асабістае рашэнне як кіраўніка дзяржавы»

Зараз Курманбек Бакіеў знаходзіцца ў Казахстане разам са сваёй сям`ёй, паведаміў у нядзелю прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас наведвання касцёла Найсвяцейшай Панны Марыі ў Мінску. *"Гэта я ведаю дакладна",* — заявіў беларускі кіраўнік.

"Бакіеў сёння знаходзіцца на поўдні Казахстана разам са сваёй сям'ёй — маленькім сынам пяцігадовым і дачкой дзевяцігадовай, жонкай", — сказаў Лукашэнка.

"Мяне здзіўляе, чаму тыя, хто пра гэта ведае, не хочуць казаць або кажуць наадварот. Чаму адбываецца ўсё гэта? Я вельмі ўважліва ўсё гэта адсочваю. Забаўна і дзіўна ўсё атрымліваецца і нават па-блюзнерску. Сёння чарговы раз я пачуў, праўда, з расійскіх СМІ (асноўных каналаў пры тым, не проста нейкія там укідванні жоўтай прэсы ці ў інтэрнеце), *што месцазнаходжанне Бакіева невядомае. Гэтым панам усё вядома — дзе ён знаходзіцца, чым ён займаецца. Больш за тое, вядома, як усё было",* — мяркуе кіраўнік дзяржавы.

Паводле яго слоў, "гульню тут вядуць і так званы часовы ўрад Кыргызстана, і Расія з Казахстанам, і, я так падазраю, што і Амерыку да гэтага прышпілілі". *"Але я думаю, што ў мяне будзе магчымасць абмеркаваць усе гэтыя пытанні з самім прэзідэнтам Кыргызстана і іншымі, і пераканацца, маю я рацыю тут ці не",* — зазначыў Лукашэнка.

"Відаць, не хочацца маім калегам у Казахстане і, напэўна, у Расіі, каб скінуты сілай прэзідэнт Кыргызстана дзесьці знаходзіўся ў іх, таму што супраць яго распачата крымінальная справа, наколькі я разумею. І вы ведаеце, ганьба цяперашняй часовай уладзе ў Кыргызстане заключаецца ў тым, што яны, напэўна, чакаюць, калі Бакіеў пакіне Казахстан, каб аб`явіць яго ў міжнародны вышук", — выказаў меркаванне Аляксандр Лукашэнка.

"Хачу яшчэ раз пацвердзіць — калі прэзідэнту Кыргызстана патрэбна будзе падтрымка ў гэтую цяжкую хвіліну для яго сям`і (мяне яшчэ больш непакояць дзеці), яна будзе аказана ўсялякая ў Беларусі. Калі ён захоча прыехаць у Беларусь — хоць сёння, хоць заўтра, паслязаўтра — мы гатовыя прыняць яго тут", — заявіў Лукашэнка.

"Я ведаю, што зараз узнімецца вой ва ўсіх сродках масавай інфармацыі, але я паўтараю — гэта маё асабістае рашэнне як кіраўніка дзяржавы. Я маю права на гэтае рашэнне. Няхай мяне асуджаюць, не асуджаюць, але здраджваць людзям — гэта самае бессаромнае, што можа быць у гэтым свеце".

ТЫМ ЧАСАМ...

Бакіеў скраў 200 мільёнаў долараў?

Часовы ўрад Кыргызстана заклікае заблакіраваць сродкі, выведзеныя за мяжу атачэннем Курманбека Бакіева.

Як паведамляе Lenta.ru, пра гэта заявіў намеснік кіраўніка часовага ўрада Кыргызстана **Тэмір Сарыеў**.

Па словах Сарыева, 7--8 красавіка, калі ў Кыргызстане пачаліся беспарадкі, якія скончыліся зменай улады, праз шэсць камерцыйных банкаў было выведзена каля 200 мільёнаў долараў. Сарыеў сцвярджае, што "падкантрольныя Бакіеву людзі" могуць выкарыстоўваць гэтыя грошы для падрыхтоўкі тэрактаў з мэтай дэстабілізацыі становішча ў рэспубліцы.

Раней у часовым урадзе Кыргызстана заявілі, што грошы былі пералічаны ў адзін з амерыканскіх банкаў. Гэтае пытанне абмяркоўвалася на сустрэчы Сарыева з памочнікам дзяржсакратара ЗША па Паўднёвай і Цэнтральнай Азіі **Робертам Блэйкам.**

Беларусь так і засталася адзінай суседкай Польшчы, якая не абвясціла жалобы ў памяць ахвяр авіякатастрофы пад Смаленскам. Хаця пад націскам грамадскасці кіраўнік нашай дзяржавы ўсё ж такі саступіў і на дзень пахавання прэзідэнта Польшчы Леха Качыньскага і ягонай жонкі Марыі абвясціў на шэсць гадзін забарону на забаўляльныя праграмы па тэлебачанні і радыё. Зразумела, што суседзі заўважылі такія незразумелыя паводзіны афіцыйнай Беларусі. І заўважылі тую бездань, якая падзяляе беларускі афіцыёз і простых жыхароў краіны.

Прапануем вашай увазе пераклад артыкула гданьскага журналіста ***Марка ВОНСА****, які змясціла польская "Газета Выборча".*

«Дзякую за беларускія сцягі на плошчы Пілсудскага і перад Прэзідэнцкім палацам»

Дзякую за беларускія сцягі на плошчы Пілсудскага і перад Прэзідэнцкім палацам. Яны былі выразна бачныя. Не рэжымныя, а гэтыя сапраўдныя, бел-чырвона-белыя. Паводле легенды, гэты сцяг сімвалізуе скрываўленую павязку рыцара з-пад Грунвальда.

Уся мая сям'я з боку мамы адтуль. З Горадні, Ліды, Наваградка, Мастоў, Ваўкавыска, Шчучына, Слоніма, Васілішак... У Катыні забілі сваяка маёй бабкі. Станіслаў Спевак быў дырэктарам пачатковай школы ў Мікелеўшчыне і афіцэрам запасу. Мікелеўшчына ляжыць між Мастамі і Каменкай. Позняй восенню 1939 года ён вярнуўся з вайны і сам з'явіўся перад савецкім "начальствам", бо такое было распараджэнне ўлады. Перад тым, як загінуць, ён паспеў прысласць дзве запіскі з няволі. Разам з ім загінуў іншы настаўнік гэтай школы, не наш сваяк, але якога ў нас заўсёды згадваюць, бо ён вучыў некаторых маіх цётак — Ян Бобэр.

Такіх сем'яў, як мая — на Памор'і сотні. Прозвішчы маіх сваякоў: Даўгялевіч, Дзякевіч, Баўтрукевіч, Пяцэвіч... Прозвішча маёй бабкі: Маскевіч.

У маёй сям'і ўсе выехалі на захад, ніхто не застаўся над Нёманам, няма каго там наведваць. Але дзякуючы ўспамінам ужо памерлай бабкі Ані, Беларусь для мяне — другая айчына. Я быў крануты, убачыўшы беларускія сцягі на пахавальных урачыстасцях.

Усе ў сям'і ведалі бабчына пачуццё гумару. Бабця, прабач, але я ўжо дарослы і ведаю, што ты не магла быць знаёмая з Алаізай Ажэшка. У тваім садзе не было магілы Яна і Цэцыліі (вядомых з рамана А.Ажэшка "Над Нёманам". — Рэд.). Але гэта дзякуючы табе я ведаю, як выглядае беларускі сцяг і герб — "Пагоня". Дзякуючы табе я ведаю, што Горадня была найпрыгажэйшым горадам у свеце, бо ў ім было столькі касцёлаў, колькі цэркваў і сінагогаў.

Год таму я пазнаёміўся з новым жыхаром Гданьска. Кірыл паходзіць з Гародні, яму 22 гады, мы некалькі разоў пайшлі на чарку. Кірыл — піяніст. Некалькі дзён таму ён заняў чацвёртае месца ў прэстыжным конкурсе для піяністаў у Барселоне. Я вельмі ім ганаруся...

Марк ВОНСА, "Газета Выборча".
Пераклад Радыё Свабода.

Поведение Лукашенко вполне понятно

Такое заявление сделал ведущий эксперт российского Центра политической конъюнктуры Павел Салин.

— Поведение Лукашенко вполне понятно. Он примеряет данную ситуацию на себя, т.к. он на всем постсоветском пространстве следующий потенциальный кандидат на "тюльпановую" революцию, — цитирует Салина издание "Взгляд. Деловая газета". — Причем, если в случае подобных событий раньше он мог бы быть поддержан Россией и рядом других государств на постсоветском пространстве, то сейчас вполне может быть, что если события в Беларуси развернутся по подобному сценарию и за этим будет стоят Запад, — то Россия будет сохранять примерно такую же позицию, как в случае с Бакиевым: "Сам виноват".

Здесь Лукашенко не то что бы сильно испугался, но напрягся и демонстрирует свою солидарность с президентом.

Слишком знакомые проблемы

По мнению главы Аналитического департамента Центра политических технологий **Татьяны СТАНОВОЙ**, Лукашенко принимает проблемы Бакиева очень близко к сердцу. "Он видит в киргизских событиях модель, которая может быть реализована и в его стране. Речь идет о силовой смене власти. Нет ничего удивительного в том, что Лукашенко поддерживает ту сторону, с которой себя ассоциирует", -- сказала она.

По словам политолога, для "батьки" крайне важно, какую позицию занимает Россия. Он очень болезненно воспринял то, что Москва поддержала новую киргизскую власть. В конечном счете именно от России во многом будет зависеть, чем закончится в Беларуси попытка реализовать киргизский сценарий. Поэтому Лукашенко решил заранее дискредитировать Кремль, показав, что он поддерживает нелегитимные правительства и мятежников.

www.gzt.ru

В Бишкеке пикетировали посольство Беларуси

Общественное движение "Седьмое апреля" просит президента Беларуси Александра Лукашенко не принимать на своей территории экс-президента Кыргызстана Курманбека Бакиева.

Свои требования представители движения озвучили 19 апреля на пикете возле здания посольства Беларуси в Бишкеке.

По словам одного из участников акции Ондуруша Токтонасырова, участники пикета просят президента Беларуси "не вмешиваться в дела чужого государства" и не принимать Бакиева.

Данную просьбу лидеры объединения озвучили на приеме у посла Беларуси Виктора Денисенко, который заверил их в том, что в данный момент Бакиев не находится на территории Беларуси.

Участники движения просят президентов Казахстана, Украины и других стран не принимать Бакиева. Они намерены провести пикет также и перед зданием посольства Казахстана, сообщает АКИpress.

КАЛІ ВЯРСТАЎСЯ НУМАР...

Бакіеў пакінуў тэрыторыю Казахстана. Куды накіраваўся зрынуты прэзідэнт — пакуль невядома

Экс-прэзідэнт Кыргызстана Курманбек Бакіеў учора пакінуў тэрыторыю Казахстана, паведаміў афіцыйны прадстаўнік МЗС рэспублікі Аскар Абдрахманаў.

"Як мне вядома, Курманбек Бакіеў пакінуў тэрыторыю Казахстана. Куды ён накіраваўся, нам невядома", — сказаў ён на брыфінгу ў панядзелак у Астане, перадае "Інтэрфакс".

На пытанне пра тое, ці пакінуў К.Бакіеў тэрыторыю Казахстана разам са сваёй сям'ёй, прадстаўнік МЗС адказаў: "Напэўна".

Меркаванні беларусаў на прапанову Аляксандра Лукашэнкі даць палітычны прытулак былому прэзідэнту Кыргызстана Курманбеку Бакіеву чытайце на 6-й старонцы.

Іх лёс хвалюе Беларусь!



Юрый Захаранка
знік 4000 дзён таму

Віктар Ганчар
знік 3868 дзён таму

Анатоль Красоўскі
знік 3868 дзён таму

Дзмітрый Завадскі
знік 3573 дні таму

СУД!

Сяргей Каваленка: «Я ведаў, на што іду...»

Сёння, 20 красавіка, у Віцебску распачынаецца судовы працэс над мясцовым актывістам Сяргеем Каваленкам, які 7 студзеня гэтага года вывесіў бел-чырвона-белы сцяг на галоўнай гарадской ёлцы.

Актывіста абвінавачваюць у злосным хуліганстве і супраціўленні работнікам міліцыі. Апошнія і будуць галоўнымі сведкамі супраць Каваленкі. Яны ж акрамя пакарання па крымінальных артыкулах патрабуюць па 10 мільёнаў матэрыяльнай кампенсацыі за маральны ўрон — нібыта актывіст іх публічна зневажаў падчас затрымання.

Апазіцыянер сваёй віны не прызнае: ён кажа, што не аказваў супраціўлення супрацоўнікам міліцыі, хаця яны яго збівалі перад тым, як пасадзіць у машыну. Факт хуліганства ён таксама адмаўляе: настойвае, што праводзіў палітычную акцыю, і гэта нельга разглядаць як хуліганскі ўчынак.

"Калі выстаўленыя абвінавачанні будуць даказаны ў судзе, мне пагражае да 6 гадоў турэмнага зняволення, — распавёў "Народнай Волі" напярэдадні суда **Сяргей Каваленка**. — На жаль, некаторыя сведкі, якія бачылі, як мяне збівалі міліцыянеры, спачуваюць, але баяцца даваць паказанні на працэсе. З якім настроем адпраўляюся на суд? З баявым. Малаверагодна, што мяне апраўдаюць, але я падрыхтаваны і да гэтага. Я ведаў, на што іду, і сёння ні аб чым не шкадую".

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
20—22 КРАСАВІКА 2010 г.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Как ищут Юрия Захаренко?

Срок предварительного расследования по уголовному делу о насильственном похищении генерала Юрия Захаренко снова продлили.

Об этом семью экс-министра внутренних дел Беларуси не так давно проинформировал следователь по важнейшим делам прокуратуры Минска, младший советник юстиции **Юрий Варавко**.

"Сообщаю, что срок предварительного расследования по уголовному делу №110352 по факту исчезновения Захаренко Ю.Н. заместителем Генерального прокурора Республики Беларусь продлен по 24 июня 2010 года. О результатах расследования Вам будет сообщено дополнительно", — написал в документе Ю.Варавко.

Стоит отметить, что следователь Варавко почему-то решил засекретить имя того заместителя генпрокурора, который принял решение не приостанавливать дело.

А проинформировать семью Захаренко "о результатах расследования" следователи в своих регулярных отписках обещают уже одиннадцать лет! И когда это случится на самом деле — не знает никто...

— В минувшем году вдове Юрия Захаренко тоже обещали сообщить о результатах расследования *"дополнительно"*, — *напомнил "Народной Воле" руководитель правозащитного центра "Правовая помощь населению" (Киев, Украина)* ***Олег Волчек***. — Тогда в своем обращении Ольга Захаренко поставила перед следствием очень конкретные вопросы на четырех листах, а в ответ получила отписку на полстранички от прокурора Минска Н.Кулика.

Хотя, в соответствии со ст.50 Уголовно-процессуального кодекса Беларуси, потерпевший имеет право получать от органа, ведущего уголовный процесс, уведомления о принятии решений, затрагивающих его права и интересы, а также получать копии этих решений. Ознакомившись со всеми постановлениями о продлении сроков предварительного расследования и постановлениями о приостановлении предварительного расследования, потерпевшие могут воспользоваться ст. 28 УПК, которая гарантирует им право участвовать в уголовном преследовании обвиняемых. Сейчас участвовать в указанном процессе Ольга Захаренко не может, так как за все время ни разу не получила полной информации о проделанной следствием работе. И следователь до сих пор не соизволил пригласить ни Ольгу Захаренко, ни ее представителя на беседу — в том числе и для того, чтобы выяснить позицию по делу.

Для меня как юриста и бывшего следователя в этом деле пока еще очень много неясного. И у самого накопилась масса вопросов.

Кто проходил или проходит подозреваемым по данному делу?

Кто из сотрудников правоохранительных органов и спецслужб отрабатывался на предмет причастности к похищению Захаренко?

Изучались ли материалы наружного наблюдения за Юрием Захаренко, которое, как известно, было установлено за ним в дни, предшествующие его похищению?

Проверялась ли версия похищения **Юрия Захаренко**, **Виктора Гончара**, **Анатолия Красовского** и **Дмитрия Завадского**, указанная бывшими следователями прокуратуры **Олегом Случаком** и **Дмитрием Петрушкевичем**, которая была подтверждена бывшим начальником следственного изолятора Минска **Олегом Алкаевым**? Ведь именно они первые заявили, что в стране действуют незаконные бандформирования из числа бойцов различных спецслужб Беларуси, называемые в народе "эскадроны смерти".

Если это неправда, то почему прокуратура до сих пор не возбудила уголовное дело против бывших сотрудников прокуратуры и МВД за ложный донос и не объявила их в международный розыск через Интерпол?

Депутат ПАСЕ **Христос Пургуридес** подготовил доклад по пропавшим политикам в Беларуси. Он заявил, что их исчезновение носит политический характер. Исследовались ли следствием факты, указанные депутатом?

Справедливости ради стоит отметить, что 8 января 2005 года органы прокуратуры сообщили в комиссию ООН, что проверяли информацию Христоса Пургуридеса "*...В связи с необходимостью проверки информации, полученной прокуратурой г. Минска 26 июля 2003 года, предварительное расследование исчезновений Ю.Захаренко, В.Гончара и А.Красовского возобновлено. Следственно-оперативными органами были рассмотрены и проверены различные вероятные причины незаконных действий, совершенных против г-на Захаренко, г-на Гончара и г-на Красовского. Они включают в себя корыстные побуждения, личную неприязнь, а также политическую и экономическую деятельность жертв. Информация, полученная в форме писем от граждан и сообщений от добровольных обществ, касающаяся этих дел, содержащаяся в меморандуме под названием "исчезнувшие люди в Беларуси" докладчика комиссии по законности и правам человека Парламентской Ассамблеи Совета Европы, г-на Христоса Пургуридеса, не осталась без внимания*".

Меня интересует, кто проходил в качестве подозреваемых по каждой версии?

Откуда появилась информация, что Юрий Захаренко мог



быть похищен из-за личной неприязни, интересно, с кем у него были такие взаимоотношения? И что включала в себя версия — корыстные побуждения?

А.Лукашенко озвучил экономическую версию похищения Захаренко. Какие факты, имеющие отношение к этой версии, подвергались проверке?

Что касается политической версии, то меня интересует вопрос, были ли все же допрошены в качестве подозреваемых **Виктор Шейман, Юрий Сиваков, Владимир Наумов** и **Дмитрий Павличенко?**

И что можно расследовать на протяжении 11 лет, при этом ни разу не пригласив родственников Захаренко или их представителей в прокуратуру и не рассказав, что было сделано и что делается для установления местонахождения похищенного человека?

Какую версию похищения Захаренко сейчас проверяет следствие?

9 сентября 2009 года Александр Лукашенко в эфире заявил: *"...У этого Захаренко был бизнес с Украиной. Вы вот этот вопрос изучите, если вам интересно. Кому-то задолжал, предупреждали его, смотри, будь внимательнее. Не я предупреждал, а люди, с которыми он в МВД работал. Нет, у меня бизнес! Задолжал миллионы. Мы и эту версию рассматриваем. Мы не одну из версий не отбрасываем. И самое главное, вам, наверное, это известно, в одной из стран мы кое-кого увидели. И быстро дали запрос — дайте нам информацию. Вот он у нас исчезнувший, а там ходит. Фотографии были и статьи в газетах, у них, не у нас. До сих пор нам информацию не представили. Понимаете, и целый конгломерат вопросов. И самое главное, что ни родственники, ни близкие, не пытаются оказать поддержку, чтобы установить истину. Все политизировано...*".

А 6 октября 2009 года в интервью российской газете "Завтра" президент страны заявил, что похищенные лидеры оппозиции действительно убиты, но не по его приказу, а якобы "на коммерческой почве"! Если это так, то почему не названы те люди, которым якобы задолжал Юрий Захаренко? Почему нам не представили конкретных фамилий, кто причастен к убийству Юрия Захаренко?

Лукашенко уже не раз заявлял, что Захаренко якобы жив и находится в Германии. МИД Германии данный факт не подтверждает. А прошлой осенью Лукашенко сообщил журналистам, что убийца Захаренко находится в Германии. Кого он имел в виду?

На мой взгляд, органы предварительного расследования не принимают должных мер для привлечения к уголовной ответственности преступников, причастных к похищению Юрия Захаренко...

Надеюсь, генеральный прокурор **Григорий Василевич** и его помощники не будут слишком долго тянуть с ответами на указанные выше вопросы. Тем более что уже почти через две недели — 7 мая — будет 11 лет, как пропал Юрий Захаренко…

Марина КОКТЫШ.

ДОСЬЕ «НАРОДНОЙ ВОЛИ»

Бывший министр внутренних дел Беларуси Юрий Захаренко был насильственно похищен 7 мая 1999 года по дороге домой.

В книге "Хроника государственной подлости", где собраны многие материалы по делу о похищении Захаренко, написано: "Предположительно в нападении на Захаренко участвовали около шести человек. Нападавшие действовали быстро и стремительно. Трое человек скрутили Ю.Захаренко и затолкали в автомобиль марки "Жигули". При этом многие свидетели отмечают, что Захаренко успел криком позвать на помощь. Автомобиль вместе с Захаренко поехал на большой скорости по пешеходной дорожке в направлении улицы Жуковского. Трое человек, которые заталкивали Захаренко в автомобиль, направились в сторону детсада..."

Бывший начальник криминальной милиции генерал-майор Николай Лопатик в своем рапорте на имя тогдашнего министра внутренних дел В.Наумова указал предполагаемое место захоронения Захаренко — "спецучасток последних могил на Северном кладбище".

ВЫБАРЫ-2010

Самі з вусамі

Ацаніць, наколькі выбары ў мясцовыя Саветы адпавядаюць міжнародным стандартам, не будзе каму. Экспертаў Бюро дэмакратычных інстытутаў і правоў чалавека АБСЕ, якія лічацца найбольш дасведчанымі ў гэтай справе, Беларусь на выбары не запрасіла.

Пра гэта афіцыйна паведаміла старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына, спаслаўшыся на традыцыю, згодна з якой місію Бюро АБСЕ запрашаюць толькі на агульнанацыянальныя выбары — парламенцкія і прэзідэнцкія.

На самай справе мы самі такую "традыцыю" і прыдумалі. Бо, напрыклад, днямі стала вядома, што назіральнікамі на мясцовых выбарах у Грузіі будуць больш за 1000 чалавек. Больш за тое, менавіта грузінскія ўлады прасілі еўрапейскія структуры прыслаць як мага болей назіральнікаў. Тлумачэнне простае: тым, хто праводзіць выбары дэмакратычна і адкрыта, хаваць няма чаго. Гэта Беларусь усё нейкія адгаворкі шукае...

Кандыдату «шыюць» крымінал

У дачыненні да кандыдата ў дэпутаты Гродзенскага абласнога Савета і Мастоўскага раённага Савета Алеся Зарамбюка распачата справа па частцы 2 артыкула 209 Крымінальнага кодэкса Беларусі (махлярства, учыненае паўторна або групай асоб).

Як паведаміў сам Алесь Зарамбюк, на мінулым тыдні ён меў намер выехаць у Вільнюс, дзе вучыцца ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце. *"Аднак мне паведамілі, што супрацоўнікі КДБ праводзяць вобыскі ў кватэры, дзе я прапісаны, у кватэры, якую я здымаю, і ў кватэры маіх бацькоў"*, — расказаў Зарамбюк.

Пазней, паводле слоў Зарамбюка, ён даведаўся, што пастанову на вобыск вынес дазнавальнік, капітан КДБ Дзмітрый Павядайка, а зацвердзіў яе — начальнік упраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці Іван Корж.

"Я адразу паехаў назад у Масты, аднак быў спынены і затрыманы ва УУС горада Ашмяны. Там я знаходзіўся да вечара. Там жа мне была выпісана позва з'явіцца 17 красавіка ва ўпраўленне КДБ па Гродзенскай вобласці ", — сказаў Зарамбюк.

Ва ўпраўленні КДБ Зарамбюку прад'явілі пастанову аб прызнанні яго падазроным ва ўчыненні махлярства. *"Мне прапанавалі даць падпіску аб нераскрыцці матэрыялаў справы. Падпіску я не даў, але быў папярэджаны аб адказнасці за раскрыццё, таму па матэрыялах справы нічога расказаць не магу"*, — патлумачыў актывіст.

"Я нічым не магу растлумачыць такую ўвагу да мяне з боку КДБ, акрамя як тым, што я балатуюся ў Гродзенскі абласны Савет і ў Мастоўскі раённы Савет дэпутатаў. Мяне яўна хочуць або дыскрэдытаваць, або прымусіць спыніць сваю выбарчую кампанію", — пракаментаваў Зарамбюк.

Сяргей Балыкін не знайшоў сябе ў спісе выбаршчыкаў

Кандыдата ў дэпутаты Мінскага абласнога Савета юрыста, эканаміста Сяргея Балыкіна не аказалася ў спісах выбаршчыкаў на ўчастку ў Маладзечне, дзе ён сам павінен галасаваць.

Як сказаў БелаПАН Сяргей Балыкін, ён па ўласнай ініцыятыве вырашыў праверыць, ці ўключаны ў спіс выбаршчыкаў на мясцовых выбарах.

"Спадзяюся, што гэта не нейкая зламысная акцыя, а непаразуменне, бо мне былі прынесеныя шматлікія прабачэнні, а ў спісы выбаршчыкаў мяне ўнеслі. Хоць якобы задолжал Юрий Захаренко? Почему нам не представили конкретных фамилий, кто причастен к убийству Юрия Захаренко?

Лукашенко уже не раз заявлял, что Захаренко якобы жив и находится в Германии. МИД Германии данный факт не подтверждает. А прошлой осенью Лукашенко сообщил журналистам, что убийца Захаренко находится в Германии. Кого он имел в виду?

На мой взгляд, органы предварительного расследования не принимают должных мер для привлечения к уголовной ответственности преступников, причастных к похищению Юрия Захаренко...

Надеюсь, генеральный прокурор **Григорий Василевич** и его помощники не будут слишком долго тянуть с ответами на указанные выше вопросы. Тем более что уже почти через две недели — 7 мая — будет 11 лет, как пропал Юрий Захаренко…

Марина КОКТЫШ.

ПАЛІТКУХНЯ

Анатоль ЛЯБЕДЗЬКА: «Працэс вылучэння кандыдата ў прэзідэнты ад партыі ўжо распачаўся»

Днямі адбылося пасяджэнне Нацыянальнага камітэта Аб'яднанай грамадзянскай партыі. На ім была прынята заява, згодна з якой АГП пакідае за сабой права вылучыць партыйнага кандыдата на будучых прэзідэнцкіх выбарах. Ці азначае гэта, што адна з вядучых партый адмаўляецца ад ідэі вынайсці сцэнар вылучэння адзінага кандыдата ў прэзідэнты ад дэмакратычных сіл?

"Мы гатовыя працягваць кансультацыі з іншымі палітычнымі сіламі ў любым фармаце, але ў сітуацыі адсутнасці пазітыўнага выніку па пытанні вызначэння адзінага кандыдата ў прэзідэнты ад прыхільнікаў перамен АГП заяўляе аб вылучэнні ўласнага кандыдата на прэзідэнцкі пост", — гаворыцца ў дакуменце.

Ужо распачалася праца па фарміраванні ініцыятыўнай групы па вылучэнні кандыдата ад АГП. Найбольш верагоднымі кандыдатамі на прэзідэнцкі пост ад партыі з'яўляюцца яе старшыня — **Анатоль Лябедзька** і ягоны намеснік — эканаміст **Яраслаў Раманчук**.

"Народная Воля" датэлефанавалася Анатолю Лябедзьку з тым, каб ён растлумачыў пазіцыю Аб'яднанай грамадзянскай партыі наконт удзелу ў будучай прэзідэнцкай кампаніі:

— Нагадаю, што ніводная палітычная партыя ў Беларусі не прыклала столькі намаганняў, каб у гэтай прэзідэнцкай кампаніі быў адзіны кандыдат ад апазіцыі, колькі Аб'яднаная грамадзянская партыя, — гаворыць Анатоль Уладзіміравіч. — Але палітычная сітуацыя ўнутры беларускай апазіцыі змянілася. Таму наша партыя проста вымушана ісці паралельным курсам. Адзначу, што АГП ні ў якім разе не ставіць крыж на праекце "адзіны кандыдат". Мы, шчыра кажучы, проста стаміліся чакаць нейкіх канструктыўных дзеянняў у гэтым накірунку ад калег па дэмакратычным лагеры. Таму і распачалі поўнамаштабную падрыхтоўку да будучай прэзідэнцкай кампаніі са сваім кандыдатам.

Калі сітуацыя ўнутры апазіцыі зменіцца, то Аб'яднаная грамадзянская партыя заўжды гатова да перамоў. А калі ўсё застанецца як ёсць — вяла і з пеставаннем амбіцый, то мы пойдзем на выбары са сваім кандыдатам.

— Кандыдаты ад АГП адмовіліся ад удзелу ў кампаніі па выбарах дэпутатаў у мясцовыя Саветы, спаслаўшыся на недэмакратычнасць выбарчага працэсу. Ці ёсць у вас спадзяванні, што прэзідэнцкая кампанія будзе праходзіць інакш?

— Не трэба блытаць боб з гарохам. Людзі, якія нават не займаюцца палітыкай — шараговыя выбаршчыкі, разумеюць, што прэзідэнцкія выбары — гэта пытанне рэальнай улады ў Беларусі. У той жа час выбары ў мясцовыя Саветы фактычна не надзяляюць пераможцаў рэальнай уладай і не ўплываюць на сітуацыю. Гэта адчуваецца па настроях выбаршчыкаў. Многія сацыялагічныя апытанні сведчаць аб тым, што людзі не пойдуць на гэтыя выбары. З прэзідэнцкай кампаніяй усё інакш. Выбаршчык пойдзе галасаваць, таму што ў людзей ёсць хоць невялікае, але спадзяванне на перамены, на тое, што яны могуць адбыцца менавіта праз прэзідэнцкія выбары. АГП зняла сваіх кандыдатаў з мясцовых выбараў, зразумеўшы, што падлік галасоў на 100% застаецца ў руках існуючай улады. Гэта быў лагічны і прадуманы крок.

— Думаеце, што падчас прэзідэнцкай кампаніі сітуацыя будзе іншай?..

— Я не выключаю, што яна будзе аналагічнай, але ўдзельнічаць у гэтай кампаніі трэба. Разумееце, прасцей за ўсё ляжаць на канапе, нічога не робячы...

Аб'яднаная грамадзянская партыя — самадастатковая структура. За намі стаіць не абстрактны народ, а канкрэтныя асобы — Станіслаў Багданкевіч, Міхаіл Чыгір, Васіль Старавойтаў, Васіль Шлындзікаў, Валянціна Палевікова. Гэтыя асобы — вядомыя ў маштабах Беларусі. У выпадку чаго ў партыі хопіць сіл і рэсурсаў, каб вылучыць свайго кандыдата.

Гутарыў Віталь ГАРБУЗАЎ.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Мінчанін Дзмітрый Мазепін трапіў у «залатую сотню» расійскага бізнесу

У топ-100 найбагацейшых бізнесменаў Расіі ўпершыню трапіў мінчанін Дзмітрый Мазепін.

Мазепін — саўладальнік аднаго з найбуйнейшых расійскіх хімічных холдынгаў — "Уралхим". Капітал, з якім расійскі Forbes улічыў яго ў рэйтынг мільянераў, складае 950 мільёнаў долараў.

Дзмітрый Мазепін нарадзіўся ў Мінску ў 1968 годзе, у 1985 годзе скончыў Мінскую суворараўскую вучэльню, потым 2 гады служыў у Афганістане перакладчыкам. Пасля службы паступіў у МГИМО, атрымаў дыплом у 1992 годзе. Потым працаваў у банкаўскай сферы ў Расіі і Беларусі.

Дарэчы, у рэйтынгу-2010 знайшлося месца яшчэ двум выхадцам з Беларусі. На 23-й пазіцыі ўладальнік "Еўрахіма" і СУЭК Андрэй Мельнічэнка (яго капітал 4,4 млрд долараў), на 63-й яшчэ адзін былы мінчук — Міхаіл Абызаў ("Група Е4", "Новосибирскэнерго", капітал — 950 млн долараў).

СУД ДЫ СПРАВА

Пракурор папрасіў вялікія тэрміны зняволення

Учора ў Вярхоўным судзе Беларусі працягнуўся працэс па справе ваўкавыскіх прадпрымальнікаў, якіх абвінавачваюць у падрыхтоўцы тэракта і іншых злачынствах. Магчыма, ужо на гэтым тыдні будзе вынесены прысуд.

У мінулую пятніцу пракурор папрасіў суд прызнаць вінаватымі ўсіх абвінавачаных і прызначыць ім наступныя пакаранні: Мікалаю Аўтуховічу — 20 гадоў зняволення, Уладзіміру Асіпенку і Аляксандру Ларыну — па 11 гадоў, Міхаілу Казлову — 3 гады знаходжання за кратамі.

Адвакат Мікалая Аўтуховіча Павел Сапелка ўжо заявіў, што гэта справа сфабрыкавана, а даказальная база вельмі слабая.

"Нялішне будзе паразважаць, а чаму мэтай стаў менавіта Аўтуховіч? — выказаўся адвакат. — *На маю думку, таму, што такі бізнесмен уладам Беларусі не патрэбны. Нармальны бізнесмен павінен быць напужаным, злодзеем, абыякавым, якога ненавідзяць людзі. Аўтуховіч да вобразу местачковага алігарха не падышоў. Ён незалежны, чысты перад законам, неабыякавы да бедаў і патрэб гараджан, а таксама валявы і рашучы ў адстойванні сваіх правоў. Ён мог бы знайсці паразуменне з уладай, але не стаў гэтага рабіць. Мог бы прагульваць свае прыбыткі, а замест гэтага займаўся дабрачыннасцю ды дапамогай тым, хто меў у гэтым патрэбу. Але вядома, што тых, каго ў нас любіць народ, не вельмі любіць улада. Зняволенне ў калоніі перад гэтым арыштам не зламала яго. А такі чалавек больш небяспечны за дзесятак палітыкаў-дэмагогаў, псеўдалідэраў псеўдаструктур"*.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Кандыдатам не хапае сродкаў на агітацыю

Магілёўскія кандыдаты ў дэпутаты ў мясцовыя Саветы дэпутатаў ад дэмакратычных сіл сцвярджаюць, што выдаткаваных дзяржавай сродкаў недастаткова для вядзення перадвыбарнай агітацыі.

Адзін з лідэраў аргкамітэта па стварэнні Партыі свабоды і прагрэсу Алесь Сілкоў адзначае, што для вядзення паўнавартаснай кампаніі выдаткаваных сродкаў не хапае, і ягоныя агітацыйныя ўлёткі не патрапяць ва ўсе кватэры.

— Я балатуюся ў абласны Савет дэпутатаў па Цэнтральнай выбарчай акрузе №37, на якой знаходзіцца 14.000 выбаршчыкаў, — гаворыць Алесь Сілкоў. — Выдаткаваных сродкаў дзяржавай на вядзенне выбарчай кампаніі мне хапіла, каб вырабіць 4200 чорна-белых улётак і надрукаваць 20 каляровых плакатаў. Калі ўлічыць, што на маёй акрузе каля 7000 кватэр, то гэтага недастаткова. Акрамя гэтага, я збіраюся рабіць пікеты, на якіх буду раздаваць свае агітацыйныя матэрыялы. Я хацеў вырабіць шмат тэматычных улётак для розных мэтавых груп, але з-за недастатковага фінансавання адмовіўся ад гэтай ідэі. Каб задаволіць патрэбу ў агітацыйных матэрыялах, неабходна вырабляць іх як мінімум у два разы больш.

Звольнены месяц назад са сваёй працы ў сувязі са сканчэннем працоўнага кантракта рабочы-будаўнік Мікалай Расюк балатуецца ў абласны Савет дэпутатаў па Пушкінскай выбарчай акрузе №48 і адзначае, што на выдаткаваныя сродкі надрукаваў 8000 чорна-белых улётак.

— Вырабленых мной улётак павінна хапіць толькі пры разліку на тое, што ў кожнай кватэры, куды патрапіць мая ўлётка, будуць пражываць мінімум 2—3 чалавекі. Я разлічваю толькі на гэта, інакш агітацыйных матэрыялаў не хопіць. А вось ад плакатаў я адмовіўся з-за іх дарагавізны, вырашыў усё пусціць на улёткі. У мяне на выбарчай акрузе 14.000 выбаршчыкаў, — гаворыць Мікалай.

Кандыдат у дэпутаты ў гарадскі і абласны Саветы дэпутатаў, сябра незалежнага прафсаюза радыёэлектроннай прамысловасці Аляксей Паўлоўскі адзначае, што выдаткаваных сродкаў хапіла толькі адпаведна на 20% і 40% выбаршчыкаў округ, па якіх вылучаецца кандыдат у дэпутаты.

— Магілёўская абласная друкарня пагадзілася надрукаваць мае агітацыйныя матэрыялы, — гаворыць Аляксей Паўлоўскі. — Выдаткаваных сродкаў для агітацыі ў абласны Савет дэпутатаў мне хапіла толькі на тое, каб надрукаваць 5700 самых танных чорна-белых агітацыйных улётак і 50 каляровых плакатаў. Калі ўлічыць, што на маёй абласной выбарчай акрузе 15 000 выбаршчыкаў, то сваімі агітацыйнымі матэрыяламі я "накрыю" ўсяго каля 40%.

Як кандыдату ў дэпутаты ў Магілёўскі гарадскі Савет дэпутатаў па Заводскай выбарчай акрузе №3 мне таксама выдаткавалі сродкі, якіх хапіла на друк 1500 агітацыйных улётак і 10 плакатаў такой жа самай якасці. У той жа час на маёй выбарчай акрузе пражывае 7000 выбаршчыкаў, а гэта азначае, што гэтай прадукцыі вельмі мала, і ёй можна ахапіць толькі 20% выбаршчыкаў.

Нагадаем, што, згодна з Выбарчым кодэксам, кандыдатам у дэпутаты ў гарадскі Савет дэпутатаў выдаткоўваецца грашовая сума ў памеры чатырох базавых велічынь (140 тысяч рублёў), у абласны Савет дэпутатаў — васьмі (280 тысяч рублёў).

www.zapraudu.info

ФУТБОЛ

Цесная група лідэраў

У мінулую нядзелю адбыліся матчы 4-га тура Нацыянальнага чэмпіната па футболе. Вось іх вынікі:

"Шахцёр" (Салігорск) — "Віцебск" — 1:1, "Днепр" (Магілёў) — "Партызан" (Мінск) — 3:0, "Дынама" (Брэст) — "Мінск" — 2:1, "Тарпеда" (Жодзіна) — "Белшына" (Бабруйск) — 1:2, БАТЭ (Барысаў) — "Нёман" (Гродна) — 0:0, "Дынама" (Мінск) — "Нафтан" (Наваполацк) — 0:0.

Турнірнае становішча пасля 4-га тура

Каманды	Г	В	Н	П	М	А
1. Віцебск	4	2	2	0	7—3	8
2. БАТЭ	4	2	2	0	3—0	8
3. Нафтан	4	2	1	1	8—4	7
4. Мінск	4	2	1	1	5—3	7
5. Дынама (Бр)	4	2	1	1	6—5	7
6. Дынама (Мн)	4	2	1	1	3—2	7
7. Белшына	4	2	0	2	3—5	6
6. Шахцёр	4	1	3	0	4—3	6
7. Днепр	4	1	1	2	4—7	4
9. Нёман	4	0	3	1	0—1	3
10. Тарпеда	4	0	1	3	4—7	1
12. Партызан	4	0	0	4	0—7	0

Наступны тур адбудзецца ў суботу 24 красавіка.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
20—22 КРАСАВІКА 2010 г.

ТОЧКА ЗРЕНИЯ

Бюджет как поле для фантазии

То, что для любой страны немыслимо, у нас — обыденность. Мы настолько привыкли жить в состоянии какого-то абсурда, что даже не задумываемся над новостями, которые озвучивает власть. Но если вдуматься...

Что такое бюджет страны? Это главный финансовый закон, который принимается парламентом и по которому должны жить все ведомства. Во всех странах из-за бюджета идут самые горячие споры, поскольку именно от него зависит, какая пенсия будет у пенсионеров, какая зарплата у чиновников, будет образование реально бесплатным или только формально и так далее. Однако белорусский бюджет — это что-то иллюзорное до неприличия. Я никак не могу понять, зачем его вообще принимают, если государственную казну изначально считают по взятым с неба цифрам.

Ну, например, бюджет Беларуси на этот год рассчитан, исходя из того, что наша страна будет платить России за газ в среднем 166 долларов за 1 тысячу кубических метров голубого топлива. В действительности же представители "Газпрома" уже заявили, что средняя цена газа для Беларуси будет выше — не менее 171,5 доллара за тысячу кубометров.

Все прекрасно понимают, что стоимость газа — это для нашей экономики один из важнейших показателей. Поэтому здесь ошибка в расчетах требует пересмотра всей и расходной, и доходной частей бюджета. Но министр финансов Андрей Харковец недавно сообщил, что "Минфин Беларуси пока не планирует пересматривать параметры госбюджета на 2010 год в связи с тем, что цена на российский газ будет выше запланированной". Но объясните, кому тогда нужны такие параметры, если они изначально базируются не на реальных, а на каких-то придуманных цифрах?

Сергей УСТИНОВИЧ.

Минск.

ДЫЯГНАЗ

Амаль кожны трэці медык звальняецца пасля адпрацоўкі па абавязковым размеркаванні

На мінулым тыдні падчас online-канферэнцыі БЕЛТА міністра аховы здароўя Беларусі **Васіля Жарко** традыцыйна ўзніклі пытанні кадравага дэфіцыту ў медыцынскай галіне. Жарко ў чарговы раз паабяцаў: *"З улікам размеркавання цяперашніх выпускнікоў у дадзеным годзе не будзе ўжо ніводнай участковай бальніцы альбо амбулаторыі без урача. Зараз працуем над змяншэннем нагрузкі на ўрача"*. Але адкуль такая ўпэўненасць?

Пасля такіх заяў Жарко ўзгадалася выніковая калегія Міністэрства аховы здароўя, якая адбылася ў лютым гэтага года. Там танальнасць выступаючых чыноўнікаў ад медыцыны была іншай, мінорнай. Так, напрыклад, прагучала, што ў 2009 годзе ва ўчастковыя бальніцы Беларусі размеркавалі ўдвая больш выпускнікоў, чым у папярэднім, 2008-м, аднак укамплектаванасць урачамі-тэрапеўтамі і участковымі педыятрамі лепшай не стала. Больш за тое, каэфіцыент сумяшчальніцтва медыкаў у мінулым годзе вырас і складае зараз 1,41 стаўкі. Для параўнання: у 2008 годзе ён дасягаў 1,39 стаўкі. Старшыня Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя **Алена Бельская** назвала тады як мінімум дзве галоўныя прычыны такой з'явы — заробкі і адток кадраў. Толькі ўявіце: каля 40 працэнтаў маладых урачоў сыходзяць з медыцыны альбо шукаюць працу за межамі Беларусі.

— *Летась сярэднемесячная заработная плата работнікаў аховы здароўя была 772,8 тысячы рублёў, або 276 долараў ЗША, што складае 71,1 працэнта ад сярэдніх заробкаў у прамысловасці*, — паведаміла Алена Бельская. — *Пры гэтым упершыню за апошнія дзесяць гадоў рэальная заработная плата знізілася на 3,1 працэнта, хоць увогуле па народнай гаспадарцы зніжэнне склала 0,4 працэнта. І толькі летась у Мінску быў адзначаны рост рэальных заробкаў работнікаў аховы здароўя на 1,4 працэнта, што з'яўляецца сведчаннем увагі да нашай галіны з боку сталічных улад. У сярэднім 30 працэнтаў маладых спецыялістаў звальняюцца пасля абавязковага тэрміну адпрацоўкі. Па звестках анкетавання, з агульнай колькасці тых, хто звольніўся летась, 50 працэнтаў планавалі працаўладкавацца ў дзяржаўныя арганізацыі, 10 працэнтаў — у прыватныя, 37,7 працэнта не паведамілі пра свае планы, а 2,3 працэнта агучылі свой намер паехаць працаваць за межы Беларусі. Апошнія лічбы асабліва насцярожваюць, улічваючы сусветныя тэндэнцыі працоўнай міграцыі медыцынскіх работнікаў. У інтэрнэце ўжо сёння можна знайсці мноства падобных прапаноў з Польшчы, Чэхіі, Іспаніі і іншых краін.*

Якія ж змены адбыліся ў медыцынскай галіне за два месяцы, што дазволілі міністру аховы здароўя ўпэўнена сцвярджаць, што ў 2010 годзе "*не будзе ўжо ніводнай участковай бальніцы альбо амбулаторыі без урача*"?

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

ВНИМАНИЕ!

Опасайтесь прогулок в дождь

Белорусские медики рекомендуют в ближайшее время ограничить пребывание на открытом воздухе во время дождя и не использовать дождевую воду в хозяйственных целях. Это связано с тем, что над территорией Беларуси находится вулканическое облако, образовавшееся в результате извержения вулкана в Исландии, сообщили корреспонденту БЕЛТА в Министерстве здравоохранения.

По данным Республиканского центра радиационного контроля и мониторинга окружающей среды, вулканическое облако проходит над Беларусью примерно на расстоянии 6 км от земли.

По данным ВОЗ и в соответствии с исследованиями Республиканского научно-практического центра гигиены установлено, что вдыхание атмосферного воздуха, содержащего химические загрязнители в концентрациях ниже рекомендуемых безопасных величин, не приводит к неблагоприятным эффектам, влияющим на здоровье. Однако существуют группы людей с повышенной чувствительностью, чье здоровье ослаблено сопутствующими заболеваниями. Эти люди могут испытывать недомогание, связанное с воздействием атмосферных загрязнителей при их концентрации, равной или близкой к рекомендуемым безопасным значениям. *"Возможно, часть пыли будет с осадками вымываться на землю, поэтому мы рекомендуем в ближайшее время ограничить пребывание на открытом воздухе во время дождя и не использовать дождевую воду в хозяйственных целях"*, — отметили в Минздраве.

РЭПЛІКА

Абакралі

10 красавіка 2010 года па тэлеканале "Лад" прайшла перадача "Лабірынты Цёткі". Усе цытаты, усе фатаграфіі былі выкарыстаны ў гэтай перадачы з маіх кніг без усялякай спасылкі на першакрыніцы.

Вывучэннем жыцця і творчасці Цёткі я займалася больш як паўвека. Першая мая кніга, прысвечаная нашай выдатнай паэтэсе "Цётка. Алаіза Пашкевіч. Крытыка-біяграфічны нарыс" выйшла ў 1956 годзе. Але з таго часу я не спыняла працы над спадчынай гэтай выдатнай жанчыны. Я ездзіла ў камандзіроўкі ў Львоў, у Ленінград, у Кракаў, у Вільню, у Вроцлаў, Лодзь і Познань, наведвала архівы, бібліятэкі, знаходзіла ўсё новыя і новыя дакументы, фатаграфіі, і з'явіліся новыя кнігі — "Стану песняй" у 1990 годзе і нанова адрэдагаваная "На полыми любві" ў 2008 годзе.

Цяпер маю працу прысвойваюць усе, каму захочацца, а канал "Лад" чарговы раз мяне абакраў.

Няхай аўтары гэтай перадачы папросяць у мяне прабачэння.

Лідзія АРАБЕЙ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Палітсалдат

14 красавіка Францішак Вячорка быў звольнены з войска па стане здароўя. Цягам 15 месяцаў службы былы лідэр "Моладзі БНФ" аспрэчваў свой прызыў як незаконны. У войску змагаўся за свае правы і правы іншых салдатаў. У інтэрв'ю Народнай Волі" падзяліўся думкамі пра службу, стан сучаснага войска і планы на будучыню.

— Што ты адчуў, калі сказалі, што вызваляюць?

— Эйфарыя. Закружылася галава. Але да апошняга не верылася. Толькі калі пераступіў парог КПП, зразумеў, што вайсковае зняволенне скончылася. Першае, што хацелася, — зняць форму.

— Цябе вызвалілі раней тэрміну. Што адбылося?

— Мяне камісавалі па хваробе сэрца, з якой служба ў арміі забаронена. У выніковым эпікрызе напісана, што "хвароба набыта ў арміі". Але і ўрачы, і я сам разумеем, што гэта ад нараджэння, і ніякія нагрузкі да такога захворвання прывесці не маглі.

— Атрымоўваецца, ты ўсё-такі даказаў, што твой прызыў быў несправядлівы?

— Не проста несправядлівы — незаконны! Гэта было працяглае жорсткае змаганне: 5 судовых працэсаў, больш за 10 пракурорскіх праверак, публікацыі ў СМІ, міжнародныя акцыі салідарнасці. Апошняй кропляй стала маё вылучэнне на выбарах... Спецслужбы пабачылі, што са мной змагацца бессэнсоўна. Лічу, што маё звальненне — перамога. Гэта таксама прыклад для іншых юнакоў, якія лічаць, што іх прызвалі незаконна.

— А як гэта выглядала? Да цябе проста прыйшлі і сказалі: збірай рэчы, можаш ехаць дадому?

— Уся працэдура камісавання заняла паўтара месяца. 2 сакавіка мяне палажылі ў Галоўны вайсковы шпіталь — у тое самае 1-е кардыялагічнае аддзяленне, дзе мяне абследавалі пры прызыве. Тады мае дыягназы былі сфальсіфікаваныя, мяне збілі ў палаце і гвалтам завезлі ў ваенкамат. Гэтым разам мяне абследавалі сумленна, выявілі гіпертэнзію і недастатковасць сардэчнага клапана. У навукова-практычным цэнтры "Кардыялогія" пацвердзілі дыягназ. Ваенна-ўрачэбная камісія прызнала мяне непрыгодным да службы ў войску. Потым вярнулі ў часць, там прабыў месяц у чаканні дакументаў з Мінска.

— Ці збіраешся аспрэчваць свой прызыў?

— Так. Людзі, якія парушаюць законы і правы іншых, павінны несці адказнасць. Гэта і прызыўная камісія, і медыкі, якія перапісвалі дыягназы, і супрацоўнікі Службы бяспекі прэзідэнта, што збівалі мяне ў шпітальнай палаце, і тыя, хто ўсё гэта рэжысіраваў. Буду патрабаваць кампенсацыі і абвяржэння ад БТ і Беларускай ваеннай газеты "Во славу Родины". У справядлівасць суда не веру, але імёны ўдзельнікаў спецаперацыі "палітычны прызыў" застануцца ў гісторыі.

— Чым жа ты так насаліў дзяржаўным СМІ?

— За час службы пра мяне і іншых палітсалдат паказалі як мінімум пяць сюжэтаў на БТ і адзін фільм. У "Беларускай ваеннай газеце" некалькі разоў на месяц выходзілі абразлівыя пасквілі. Уся іх сутнасць у адным: "апазіцыянеры толькі ўмеюць, што крычаць на мітынгах, а служыць не хочуць". Мяне выстаўлялі фашыстам, клоунам, "косарам". Усяляк спрабавалі дыскрэдытаваць. Здаецца, пасля майго вызвалення яны павінны былі падціснуць хвост. Пару дзён таму быў апублікаваны чарговы пасквіль.

— А як на гэтыя публікацыі рэагавалі таварышы па службе?

— Смяяліся. Яны ж бачылі, які я насамрэч. Абсалютная бальшыня і салдат, і афіцэраў мяне негалосна падтрымлівалі. Былі, праўда, пару чалавек, якія згадзіліся даць інтэрв'ю Першаму каналу супраць мяне. Пасля апраўдваліся, што іх прымусіў нампаліт. Увогуле, камандаванне і кадэбэшнікі вытанчана маніпулявалі салдатамі, збіралі на кожнага кампрамат: хто дзе напіўся, заснуў на дзяжурстве, быў злоўлены ў самаволцы... Ім прапаноўвалася "выкупіць" сваю віну і аказаць "паслугу", у адваротным выпадку пагражалі пракуратурай.

— І што гэта былі за паслугі?

— У асноўным ім прапаноўвалася стаць шасцёркай: дакладваць начальству пра ўсе мае размовы і дзеянні. Аднойчы даручылі "здаць" мой мабільны тэлефон. Тады пад выглядам майго здалі нампаліту зусім левы апарат. Потым упарта ўгаворвалі прынесці са звальнення дыскі з "якой-небудзь парнушкай". Правакавалі на бойку. Але я паводзіў сябе вельмі асцярожна і стараўся з усімі сябраваць: гэта мяне і ўратавала.

— Кажуць, вайсковыя сябры — самыя лепшыя. Сярод тваіх таварышаў па службе былі такія?

— Ёсць некалькі чалавек, якіх я магу назваць сапраўднымі сябрамі, якія не падвялі, у цяжкія моманты — падтрымалі. Камандаванне імкнулася, каб са мной як можна менш кантактавалі. Аднаго дагэтуль працягваюць цкаваць, яшчэ аднаго — перавялі ў іншую часць. Але мы абмяняліся кантактамі, будзем падтрымліваць сувязь.

— Былы палітсалдат Іван Шыла казаў, што дзедаўшчыны ў войску амаль няма. А як з гэтым у цябе?

— У нас быў перагіб у адваротны бок. Наша часць лічыцца ўзорна-статутнай. Калі нехта недзе "заляцеў", адпраўляюць на перавыхаванне да нас. Сярод салдат мазырскую часць жартаўліва называюць дысбатам. Ад дзедаўшчыны засталіся некаторыя традыцыі, мянушкі, "пераводы", у тым ліку грашовыя. Мне здаецца, камандаванне зацікаўлена ў "дзядусе", гэтак лягчэй кантраляваць калектыў. Правакацыі супраць мяне рабіліся рукамі гэтак званых "дзядоў". Для іншых салдат гэта гульня на паўтара года, якая дае магчымасць паказаць сябе і разнастаіць час. Але я ў гэтым прынцыпова не ўдзельнічаў.

— Кажуць, гэта добра, што апазіцыянераў пачалі забіраць у войска, маўляў, паразмаўляюць з простымі людзьмі, паагітуюць...

— Цягам службы я нікому не навязваў свой пункт гледжання, калі пыталіся — выказваўся. Гэта дзейнічала як найлепшая агітацыя. Многія задумваліся. Некаторыя адкрыта сімпатызавалі. Аднак салдаты ў асноўнай бальшыні абыякавыя да палітыкі. Яны не лічаць, што ад іх нешта залежыць. Але некалькі чалавек адразу па заканчэнні службы збіраюцца далучыцца да "Моладзі БНФ".

— Ці змянілася стаўленне да вайсковай службы?

— Я па-ранейшаму лічу, што тэрміновая служба ў Беларусі — перажытак саветчыны. Калі кажуць, што войска кагосьці зрабіла мужчынам, значыць, дагэтуль ён быў бурацінам. Тэрміновая служба мае мала супольнага з абаронай Радзімы. Салдаты, як і качагары, ці повары — абслугоўваючы персанал. Каб навучыцца вайсковай спецыяльнасці, дастаткова 2—3-х месяцаў. За грошы, што выдзяляюцца на тэрміновую службу, можна купіць новую тэхніку, падняць заробкі кантрактнікам, прымусіць іх працаваць. Баяздольнасць павысіцца ў разы.

— Як я зразумела, служыць табе не спадабалася?.. А вось некаторыя іншыя з "палітпрызваных" выказваліся пра войска нейтральна ці нават пазітыўна...

— Яны абралі іншую мадэль паводзін. Лічу, што мой прызыў быў незаконным. Да мяне ставіліся не як да салдата, а як да зняволенага. І я змагаўся за сваё вызваленне кожны дзень. 15 месяцаў мяне ізалявалі, правакавалі, здзекаваліся. Але марна. Я не зламаўся, застаўся самім сабой. Першае, што я пачуў па прыбыцці ў Мазырскую часць: "Мы цябе перавыхаваем". Яны не ўлічылі, што мне хоць іголкі заганяй пад пазногці — я буду стаяць на сваім. Мне адразу прапанавалі служыць "як усе", адмовіцца ад публічнасці, а ўзамен атрымаць лычкі сяржанта і палёгкі ў службе. Замест гэтага я атрымаў 12 спагнанняў, у тым ліку гаўптвахта і скарачэнне адпачынку. Мяне каралі не за кепскую службу (залікі па вайсковых прадметах я здаў на выдатна), а за грамадзянскую пазіцыю. Калі ты назваўся змагаром за свабоду — будзь такім да канца. Прагнуўся адзін раз — будзеш кланяцца ўсё жыццё. Калі было цяжка, перачытваў перапіску са Зміцерам Жалезнічэнкам, Іванам Шылам і іншымі палітсалдатамі, сябрамі. Штодня прыходзілі паштоўкі і лісты падтрымкі.

— Яшчэ падчас прысягі ты абяцаў заняцца беларусізацыяй войска.

— Дзякуючы мне, нарэшце перакладзены і афіцыйна выдадзены па-беларуску вайсковыя статуты. Усю службу я прынцыпова карыстаўся толькі беларускай мовай. Спачатку мне забаранялі аддаваць каманды па-беларуску. За тое, што я адмовіўся спяваць песні на рускай мове, скарацілі водпуск да пяці сутак (у які, дарэчы, мяне так і не пусцілі). Я скардзіўся ў пракуратуру, у суд, пісаў у прэсу. І яны адступілі. Апошнія месяцы ніякіх перашкод з ужываннем мовы не было. Некаторыя афіцэры нават спрабавалі размаўляць па-беларуску. Калі быў перапіс, дабіўся таго, што ў часці з'явіліся беларускамоўныя бланкі.

— А як салдаты ставіліся да беларускай мовы?

— Спачатку насцярожана, а пазней звыклася. Бальшыня — з Магілёўскай і Гомельскай абласцей, звычайна гавораць на трасянцы, мову выдатна разумеюць. Гэта хутчэй псіхала´ічны бар'ер: "Ён размаўляе не так, як усе".

— Ты недзе пісаў, што стаў салдацкім адвакатам. З якімі праблемамі да цябе звярталіся?

— Разам з салдатамі мы дабіліся таго, што ўключылі таксафон-аўтамат, адрамантавалі зліўныя бачкі, лазню, пачалі пускаць у звальненні, пасля начнога дзяжурства дазволілі некалькі гадзін адпачываць. Да мяне звярталіся не толькі салдаты. Аднаму афіцэру дапамог вырашыць жыллёвую праблему. Мы зладзілі кампанію з патрабаваннем адрамантаваць дарогу па вуліцы Астроўскага, на якой размешчана наша часць і пражываюць некаторыя афіцэры і прапаршчыкі. Як вынік — нядаўна зрабілі ямачны рамонт. Кожная перамога давалася цяжка, са скандалам, а то і з удзелам пракуратуры.

— А як праходзіць звычайны салдацкі дзень?

Пад'ём у 6 раніцы. Умыванне. У 7.00 — сняданак. Пасля ўсе ўбываюць на баявую пазіцыю. Частка людзей заступае на дзяжурствы. Іншыя абслугоўваюць тэхніку і прыбіраюць тэрыторыю. Пасля абеду, калі не ідзеш у нарад, зноў на пазіцыю. У 19.00 — вячэра. Да 20.40 — вольны час. Каб адпачыць, падшыцца, паглядзець тэлевізар. Пасля прагулка з песнямі, прагляд "Панарамы", паверка і адбой. Салдат не хапае. Даводзіцца хадзіць у нарады праз суткі, праз двое. Бывала, у казарме начавала па некалькі чалавек.

— Ці была магчымасць чытаць кніжкі?

— Вечарам, пасля вячэры. Калі я прыйшоў служыць, у нашай часці было 6 кніжак. Цяпер іх 270. Цягам службы мае бацькі, бабуля, сябры (у прыватнасці, Ілона Урбановіч-Саўка, Уладзімір Арлоў) перадавалі кнігі; сярод іх — школьная пра´рама па літаратуры, падручнікі па замежных мовах, Быкаў, Караткевіч, Карнэгі, Муракамі, Пялевін і шмат іншага. Я склаў спіс усіх кніжак, падзяліў іх па раздзелах. Атрымалася сапраўдная бібліятэчка! Пра яе станоўча напісалі ў мазырскай гарадской ´азеце. Быў момант: адзін хлопец узяў на дзяжурства кніжку, афіцэр яе забраў. Салдат прыходзіць да мяне і жаліцца: "Ну вось! Упершыню ў жыцці сам узяў кніжку пачытаць, а яе ў мяне забралі".

— А як наконт фізічных нагрузак?

— У нас спецыфічныя войскі — радыётэхнічныя. Некаторыя іх называюць "інтэлектуальнымі", а яшчэ — "артапедычнымі". Батальён знаходзіцца ў пастаяннай баявой гатоўнасці, круцяцца лакатары, людзі — на дзяжурствах і нарадах. На фізічную падрыхтоўку папросту няма часу.

— А якія былі твае асабістыя абавязкі?

— Па пасадзе я — дызеліст-электрык. У выпадку гатоўнасці заводзіў дызель, падключаў сілкаванне да радыёлакацыйнай станцыі. Па баявым разліку я стралок акопа. Мая задача — не дапусціць прарыву пяхоты і тэхнікі праціўніка з паўднёвага кірунку. На поўдні ў нас мяжа з Украінай. Таму па ідэі я мусіў бараніць нас ад паўднёвых суседзяў, якія, як нам давялі на занятках па ідэалогіі, "прадаліся НАТО".

— Ці давяралі табе зброю?

— Так. АК-74, штык-нож, з аўтамата за час службы я страляў толькі аднойчы — тры патроны.

— Апошні месяц у інтэрнэце гучыць інфармацыя пра тваю выбарчую кампанію. Як табе, салдату тэрміновай службы, удалося стаць кандыдатам у дэпутаты Мазырскага раённага Савета?

— Давялося схітраваць. У вайскоўцаў прынята на ўсё прасіць дазволу начальства. Я ж паставіў камандаванне перад фактам, што зарэгістравана мая ініцыятыўная ´рупа. Мне забаранілі збіраць подпісы сярод салдат, нягледзячы на тое, што яны з'яўляюцца маімі выбаршчыкамі. Тады я прасіў звальненні ў горад — абвясцілі каранцін. Подпісы сабраў мой паплечнік з Мінска — Антон Койпіш. Ніхто з камандавання і ўявіць не мог, што мяне зарэгіструюць! Пакуль не ўмяшалася Лідзія Ярмошына і Гомельская вайсковая пракуратура, мяне, ужо зарэ´істраванага кандыдата, не пускалі ў горад праводзіць агітацыю.

— А чаму вырашылі балатавацца ў Мазыры? Наколькі мне вядома, вы карэнны мінчук.

— Першапачаткова я збіраўся ісці ў Мінскі гарадскі Савет. Аднак, згодна з заканадаўствам, я маю права вылучацца на той тэрытарыяльнай адзінцы, дзе прапісаны. На маёй мазырскай акрузе мяне добра ведаюць. Да таго ж тут распаўсюджана прозвішча "Вячорка". Для выбаршчыкаў я свой. Я шчыра палюбіў гэты горад. Жыхары акругі моцна пакрыўджаны ўладай, якая не хоча іх чуць. З Мазыра знялі статус радыяцыйна-забруджанай зоны, а разам з гэтым — і адпаведныя льготы, бясплатныя абеды ў школах і садах, праезд для дзяцей. Гэта было апошняй кропляй. Магчыма, жыхары раёна бачаць ува мне надзею на перамены, таму падтрымліваюць.

— Якія ў цябе планы на бліжэйшую, ужо цывільную будучыню?

— Планую пабыць у Мазыры і давесці да канца "выбарчую кампанію". У сумленны падлік галасоў я не веру. Але гэта добрая магчымасць пагаварыць з людзьмі, дапамагчы вырашыць некаторыя мясцовыя праблемы.

Падзякую тым, хто мяне падтрымліваў у войску. Дапішу "армейскі дзённік", які мае выйсці асобнай кнігай.

Вырашу пытанне з адукацыяй. Буду ўзнаўляцца ў БДУ, калі адмовяць, буду вучыцца завочна за мяжой.

Узнаўлю культурніцкія праекты: дубляж фільмаў на беларускую мову, "Партызанскую школу".

Як бы ні было, працягну змаганне з рэжымам. Збяру каманду аднадумцаў. Вярнуся ў Фронт. Вядома, шмат чаго памянялася. Трэба агледзецца.

Алена НОВІКАВА.

ДАРЭЧЫ

У Беларусі стартавала чарговая кампанія па прызыве грамадзян на тэрміновую ваенную службу і службу ў рэзерве. Указ № 182 "Аб звальненні ў запас ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы і рэзервістаў, якія выслужылі ўстаноўленыя тэрміны ваеннай службы па прызыве, службы ў рэзерве, і прызыве грамадзян на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве ў красавіку — верасні 2010 г." быў падпісаны прэзідэнтам 16 красавіка.

Як паведаміла прэс-служба Міністэрства абароны, у адпаведнасці з указам на тэрміновую службу, службу ў рэзерве будуць прызваны грамадзяне мужчынскага полу, якім да дня прызыву споўнілася 18 гадоў і якія не маюць права на адтэрміноўку ад прызыву, а таксама грамадзяне прызыўнога ўзросту, якія страцілі права на адтэрміноўку. Маладое папаўненне павінна быць накіравана на ўкамплектаванне злучэнняў і часцей Узброеных сіл, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў да 30 верасня.

Устаноўлена, што пацярпелыя ад наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС грамадзяне, прызваныя на тэрміновую ваенную службу, накіроўваюцца ў воінскія часці і фарміраванні, якія не знаходзяцца на радыеактыўна забруджаных тэрыторыях, і прызначаюцца на воінскія пасады, не звязаныя з работамі па эксплуатацыі крыніц іянізуючага выпраменьвання, звышвысокіх частот і работамі з кампанентамі ракетнага паліва.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
20—22 КРАСАВІКА 2010 г.

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

Каму будуць служыць дэпутаты-начальнікі?

"Не хачу гуляць мечанымі картамі" — пад такім загалоўкам у "Народнай Волі" за 23—25 сакавіка 2010 года было змешчана маё інтэрв'ю, дадзенае па тэлефоне Сяргею Буткевічу. Напрыканцы нашай размовы я ўпэўнена заявіў, што ў складзе кандыдатаў у дэпутаты Пастаўскага раённага Савета і на гэты раз не будзе простых людзей, шараговых грамадзян — прадстаўнікоў сялянства, рабочых, пенсіянераў, прадпрымальнікаў. А на пытанне журналіста, ці не баюся памыліцца, я паўжартам, але рашуча сказаў, што гатовы біцца аб заклад на скрыню каньяку і што калі раптам памылюся, то завітаю з гэтай скрыняй у рэдакцыю...

Сёння мушу паведаміць: на жаль, мой візіт у "Народную Волю" з каньяком адкладваецца, бо я ў сваім прагнозе не памыліўся, а наадварот: маё прадказанне спраўдзілася на ўсе 100 працэнтаў! 31 сакавіка газета "Пастаўскі край" давяла спіс зарэгістраваных кандыдатаў у раённы Савет. З 30 пільна праверараных тутэйшай уладай маючых адбыцца "слуг народа" роўна 30 начальнікаў! Да таго ж больш як 30 працэнтаў з іх уваходзілі ў раённы Савет папярэдняга склікання!

Адначасна хачу зазначыць, што многіх з гэтых людзей я асабіста ведаю і нічога дрэннага пра іх сказаць не магу. Але не магу і ўявіць, што хтосьці з іх, увогуле прыстойных і разумных, не пабаіцца заняць актыўную, смелую пазіцыю ў дэпутацкім корпусе, выступіць з крытыкай вышэйстаячых кіраўнікоў, якія нярэдка дапускаюць грубыя памылкі, хібы і нават парушэнні законаў. Яны, гэтыя "недатыкальныя" асобы, не захочуць слухаць крытыку з вуснаў падначаленых калег-дэпутатаў і лёгка знойдуць спосаб закрыць ім раты. Бо дэпутат, вылучаны з начальнікаў, знаходзіцца ў кабале прыгоннай кантрактнай сістэмы, якая падпарадкоўвае яго большаму начальніку. І нават проста сумленныя паводзіны, адрозныя ад паводзінаў паслухмянай большасці, могуць дорага каштаваць. Не толькі ў пераносным сэнсе, бо ў дэпутатаў-начальнікаў вялікія зарплаты, службовыя аўтамабілі і адміністрацыйны рэсурс. Ім ёсць што губляць разам з пасадай, а значыць, ёсць чаго баяцца...

З апублікаванага ў газеце паведамлення пра кандыдатаў у раённы Савет вынікае, што ў большасці з будучых дэпутатаў месячны даход складае ад 2 да 4,5 мільёна рублёў. Хто захоча "высоўвацца" дзеля праўды і справядлівасці, рызыкуючы такімі грашыма?

Я лічыў, лічу і буду лічыць, што гэткі падбор дэпутацкага корпусу — тормаз для развіцця грамадства, перашкода на шляху да рэформ, вораг усяго новага, перадавога. Пры гэткім, выключна кіраўніцкім, складзе Савета немагчымы аб'ектыўны грамадскі кантроль над уладай, не будзе крытыкі яе памылак і заганаў, а на сесіях не будуць разглядацца найбольш важныя, вострыя пытанні. Бо тое, што непакоіць альбо абурае простых людзей, звычайна не закранае інтарэсаў начальнікаў.

Каб не быць галаслоўным, узгадаю прыкрую гісторыю, калі шматгадовыя адлічэнні жыльцоў нашага мікрараёна на капрамонт дамоў пайшлі на дарагую афарбоўку аднаго дома з-за таго, што ён стаіць ля дарогі, па якой можа паехаць высокае начальства. І вось з адной гэтай прычыны афарбоўка фасаду абышлася ў суму, адпаведную 100.000 долараў ЗША!

Тое марнатраўства, вядома ж, абурыла жыльцоў, а вось дэпутаты засталіся абыякавымі да гэтай гісторыі. Наш тагачасны дэпутат, дырэктар школы Юрый Кісялёў, які добра ведаў пра "залаты фасад" (дарэчы, пра яго паведамляла "Народная Воля"), фактам абуральнага марнатраўства не зацікавіўся. На сёлетніх выбарах спадар Кісялёў зноў балатуецца ў той жа савет, але па іншай акрузе, дзе Юрыя Міхайлавіча не так добра ведаюць.

Кажуць, што ён — добры дырэктар школы. Магчыма, але навошта паспяховага кіраўніка, занятага нялёгкай працай чалавека, запрагаць яшчэ і ў воз дэпутацкіх турбот? Ці не таму, што ён стаяў у баку ад надзённых праблем горада і раёна?

Шаноўны рэдактар "Народнай Волі"! Паверце, мне вельмі шкада, што я не памыліўся ў прагнозе наконт складу маючага адбыцца раённага Савета. Куды лепей было б, калі б рэгістрацыя кандыдатаў прадэманстравала дэмакратычны падыход да выбарчай кампаніі. І тады б я, усцешаны гэтым, прывёз бы ў рэдакцыю тое, што абяцаў. Але цуду не адбылося. Улада зноў, як і раней, паставілася да выбараў як да падбору ўласных кадраў. На жаль, яна не разумее, што гэтым зневажае народ і сячэ сук, на якім усе мы сядзім, бо наўрад ці будуць дэпутаты-начальнікі бараніць інтарэсы народа, а значыць — і дзяржавы.

Такім чынам, кандыдаты прызначаны, участкі вызначаны, усё астатняе — справа тэхнікі.

Застаецца адно пытанне: ці варта галасаваць за дэпутатаў, ад якіх няма карысці?

Уладзімір БАРОЎКА,
выбаршчык,
палкоўнік авіяцыі ў запасе.

г.Паставы.

СПАЧУВАННІ

Смуткуем разам з вамі...

Даслаць ліст у газету мяне падштурхнула вялікая трагедыя, якая адбылася пад Смаленскам, калі раніцай 10 красавіка пацярпеў катастрофу польскі самалёт №1. Пры дапамозе "Народнай Волі" нам вельмі хацелася б выказаць спачуванне польскаму народу ў сувязі з гібеллю прэзідэнта Л.Качыньскага і яго атачэння. Мы раздзяляем ваш боль і смуткуем разам з вамі.

А.СІНЯЎСКІ,
І.АРЦІШЭЎСКІ.

Талачын.

ЭХО ТРАГЕДИИ

Россия проявила мудрость, разделив с поляками горечь утраты

Я, человек российского происхождения, хочу поблагодарить "Народную Волю" и автора Семена Букчина за публикацию "Жизнь, которая разъединяет", а также Ярослава Курского за материал "Пусть эта смерть нас объединяет".

У России, несомненно, были причины выражать недовольство политикой президента Польши. Но перед лицом польской национальной катастрофы многое в отношениях России и Польши должно уйти в небытие. Россия проявила мудрость, разделив с поляками горечь утраты, объявив по этому случаю национальный траур.

Россия становится не только объектом для критики, но и объектом для подражания.

С уважением —

Григорий Иванович ПЕТРОВСКИЙ.

Минск.

«НЕПРИЧЕСАННОЕ» ПИСЬМО

Просим рассмотреть вопрос о замене руководителя завода

Здравствуйте, уважаемая редакция!

Пишут вам рабочие Воропаевского завода ЖБИ. У нас есть вопрос к генеральному директору КУПП СП "Полоцксельстрой". Когда же мы будем иметь достойную зарплату? Полтора года назад на юбилее завода вы говорили о ее повышении. Но...

За это время контора поменяла себе мебель и компьютеры, сейчас мастер строителей с сыном делают ремонт в комнате мастеров и лаборатории, на это деньги есть, а вот расценки на выпускаемую продукцию не увеличивались почти год. Для рабочих нет комнаты отдыха, только стол в цехе и две лавки и вечно пустой бак для воды. Формовщиков на заводе человек 30, зарплата где-то 600.000 рублей. Многие работают по контракту, у них побольше получка, кому-то средний заработок платят, а у итээровцев, конечно, выходит еще выше.

Год назад хоть премиальные платили, а теперь нет интереса к работе. В марте месяце дали вроде план, но премии нет, надо за простой вагонов с цементом платить штраф, а при чем здесь рабочие? Все емкости для цемента забиты давно, а у нас на путях вагонов десять стоят невыгруженными.

У нас никто не спросил, хотим ли мы работать в три смены, просто директор вывесил приказ и все. Теперь мы не соблюдаем ни государственных праздников, ни религиозных. Спецодежду покупаем сами, на заводе ее уже не выдают. Ходим грязные, порошка стирального нет. Правда, в прошлом году дали два кусочка мыла.

Наш директор уже пару лет как достиг пенсионного возраста. К нам прислали нового, молодого, толкового главного инженера Александра Николаевича Михалевича. Мы его будем выбирать в депутаты Витебского облсовета.

Уважаемый Олег Антонович Куделко! Может, рассмотрите вопрос о замене руководителя завода?

Писал по просьбе рабочих Степан ГРИБКО.

Воропаево Витебской области.

"Коррективы" не будет

Будут ли внесены изменения в бюджет страны в связи с тем, что цена на газ, который мы покупаем у России, будет выше запланированной?

Игорь ШАМАРИН, Минск.

"Пока мы не планируем ничего пересматривать", — сказал министр финансов Беларуси Андрей Харковец, отвечая на вопрос о возможных действиях Минфина в связи с тем, что среднегодовая цена на российский газ будет выше 166 дол. за 1 тыс. куб. м, исходя из которых планировался бюджет.

Как сообщает агентство ПРАЙМ-ТАСС, ранее заместитель председателя правления ОАО "Газпром" Андрей Круглов объявил журналистам, что для Беларуси среднегодовая цена на российский газ в 2010 г. составит 171,5 дол. за 1 тыс. куб. метров.

БЛАГОЕ ДЕЛО

Любое пожертвование, даже самое малое, угодно Богу

На подъезде к Минску по обе стороны трассы расположена деревня Королев Стан. Семь лет назад здесь произошло вопиющее преступление — был сожжен храм Воздвижения Креста Господня. Это стало большой трагедией для всех православных людей. Следствие выяснило, что надругательство над православной святыней — дело рук двух минских подростков, членов языческой секты.

Строгий приговор не утолил людскую боль об утраченном храме, и в марте 2001 года по благословению митрополита Минского и Слуцкого, Патриаршего Экзарха всея Беларуси Филарета начались работы по восстановлению церкви.

Множество людей откликнулись на беду, жертвуя по мере сил деньги и стройматериалы. Восстановление церкви с трудом, но продвигалось вперед.

Сегодня, несмотря на то что строительные работы не окончены и не проведено отопление, в храме начались богослужения. Еще не устроена полностью центральная и алтарная части, не оформлен должным образом иконостас, который состоит из нескольких рядов икон. Нет достаточной церковной утвари, облачений и богослужебных книг.

В наше непростое время труд иконописца стоит дорого, и церковная утварь не по карману прихожанам, большинство из которых пенсионеры.

А еще нужно благоустроить и озеленить территорию вокруг храма, посадить деревья, разбить цветники, чтобы люди, проезжающие по трассе, могли любоваться не только великолепными формами храма, колокольней и золотыми крестами на куполах, но и чистой, ухоженной территорией: мощеными цветным камнем дорожками, розарием и хвойными насаждениями.

В настоящее время приход понемногу обновляется молодежью: много детей дошкольного и младшего школьного возраста. Для их духовного образования и воспитания необходимы занятия в воскресной школе. Приход принял решение весной заложить фундамент здания школы. Ведь дети — это наше будущее, и от того, какими они вырастут, зависит судьба нашего Отечества.

Поэтому мы обращаемся ко всем добрым людям с просьбой о помощи! По древней православной традиции представители богатых сословий жертвовали храмам иконы для алтаря с дарственной именной надписью, увековечивая тем самым память о себе в душах многих последующих поколений. На каждом богослужении совершается молебен об их здравии и долголетии, а после смерти — о даровании им Царствия Небесного.

Однако каждый верующий человек знает, что любое пожертвование, даже самое малое, угодно Богу. Поэтому не надо думать, что дать "малую лепту" неудобно или даже стыдно. Это не так. Храмы во все времена строились на "пятаки" трудового люда, и тем более велика их ценность как доказательство единоверия и братства во Христе нашего народа.

Александр ГОРБУНОВ,
настоятель храма Воздвижения Креста Господня, иерей.

Для организаций: р/с 3015452530016 в отд. №508, ОАО "Белинвестбанк", код 739 (адрес банка: 220125, г.Минск, ул.Гинтовта, 30) УНП 600351598.

Для почтовых переводов: Беларусь, 223027 Минская область, Минский район, д.Королев Стан, пер.Вознесенский, д.1, храм Воздвижения Креста Господня, настоятелю Горбунову Александру Леонидовичу.

Тел./факс храма (017) 507-70-70.

Настоятель: VELCOM (029) 658-41-99, МТС (029) 558-01-40.

ДАТА

Беларусы і палякі разам адсвяткуюць 600-годдзе Грунвальдскай бітвы

Намеснік міністра культуры Беларусі **Тадэвуш Стружэцкі** паведаміў, што пытанне сумеснага святкавання юбілею абмяркоўвалася падчас візіту міністра культуры Польшчы **Богдана Здраеўскага** ў Мінск у снежні 2009 года, на сустрэчы міністраў культуры Беларусі і Літвы, а таксама ў перапісцы з міністрам культуры Украіны. *"Ёсць дамоўленасць аб тым, што частка мерапрыемстваў будзе праводзіцца сумесна",* — зазначыў Стружэцкі.

Паводле яго слоў, міністр культуры Польшчы афіцыйна запрошаны на ўрачыстасці ў Навагрудак, далі згоду на ўдзел у іх прадстаўнікі Літвы. Стружэцкі выказаў надзею, што беларуская дэлегацыя будзе запрошана да ўдзелу ва ўрачыстасцях 15 ліпеня на Грунвальдскім полі.

Дарэчы, начальнік аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама **Аляксандр Карачан** нагадаў, што актыўны ўдзел у Грунвальдскай бітве прыняла Навагрудская харугва, аб чым сведчыць мемарыяльная дошка ў Навагрудскім фарным касцёле. Апрача таго, у горадзе напярэдадні бітвы пад Грунвальдам двойчы сустракаліся вялікі князь Вялікага Княства Літоўскага Вітаўт і кароль Польшчы Ягайла.

Аляксандр Карачан не выключае, што да свята ў гістарычным цэнтры Навагрудка на былой Рыначнай плошчы будзе ўзведзены конны манумент заснавальніку і першаму вялікаму князю ВКЛ Міндоўгу. *"Тэрміны і магчымасці дазваляюць гэта зрабіць. Аднак пакуль не вырашана праблема фінансавання пабудовы гэтага помніка з бронзы і граніту, над якім працуе мінскі скульптар Генадзь Буралкін",* — зазначыў Карачан.

Марат ГАРАВЫ,
БелаПАН.

ЭТО БЫЛО НЕДАВНО, ЭТО БЫЛО ДАВНО...

«Меня, как преступницу, провели под конвоем через весь двор...»

В редакцию пришло письмо от читательницы, которая рассказала об интересном эпизоде современной истории Беларуси. Оказывается, ровно 40 лет назад, в апреле 1970 года, в Минске произошло политическое выступление молодежи, о котором поведали все ведущие западные "радиоголоса". Наша читательница — дама довольно известная, но по личным причинам пожелала остаться неназванной. Она выражает надежду, что найдутся и другие очевидцы события...

Погожим апрельским днем за мной зашла девчонка, проживавшая на другой стороне улицы Карла Маркса, и убедила пойти погулять. Дело было после школы, уроки я быстренько сделала и отправилась с подружкой освежить голову буквально на полчаса-час. Однако домой вернулась ближе к полуночи.

Дело в том, что накануне возле кинотеатра "Новости дня" был убит случайным пьяным прохожим сосед моей визави — 18-летний **Слава Максаков**. Думаю, подружка знала, что нечто затевается, и вовсе неслучайно искала себе компаньона для похода на место происшествия.

Лично я ничего не ведала и с удивлением наблюдала скопление молодых людей возле кинотеатра. К этому моменту, собственно, акция уже заканчивалась, и все потихоньку начинали разбредаться по окрестным дворам: чтобы обсудить и заново пережить, как все это было. Я встретила там же приятеля из соседней школы, который предложил немного побродить. Пока мы бесцельно фланировали по улицам (к тому времени подружка тоже встретила кого-то из знакомых), он рассказал мне, как все происходило. Молодые люди из четырех окрестных школ — 24-й, 4-й, 2-й и 42-й, возмущенные убийством знакомого, договорились провести траурный митинг на месте убийства. Белой краской была сделана надпись: *"Здесь убили Славу Максакова, 18 лет".* Девочки возложили к стене белые цветы. Были и плакаты в руках у участников. Со слов приятеля я запомнила текст одного: *"Мы не хотим, чтобы нас убивали вечером!"* Текст запал в память, потому что сразу подумалось: *"А разве утром можно убивать?"* Для минуты молчания мальчики встали в живую цепь.

С приятелем мы дошли до "дома лесенкой", сбегавшего к Свислочи, и там во дворе я заметила многих моих одноклассников. Назавтра один из них подойдет ко мне в классе и скажет: *"Давай так: ты нас не видела, мы тебя не видели... Лады?"*

Это спонтанное молодежное выступление было все-таки политическим, хотя тогда я так не считала. Думаю, молодежь центра Минска практически впервые столкнулась с внезапной, нелепой смертью одного из своего круга. Разве в 16—18 лет кто-нибудь верит в то, что человек внезапно смертен? И многие почувствовали себя беззащитными, незащищенными ни милицией, ни властью — теми, кому положено людей защищать. Были, конечно, среди участников и просто люди с авантюрной жилкой, искавшие приключений. Были и обычные любопытствующие. Но лейтмотив протеста против несправедливости случившегося был адресован государству. И государство это уловило.

Когда где-то через час приятель предложил мне еще немного погулять по проспекту, я согласилась с условием, что на этом разбегаемся. По его инициативе мы вновь пошли на проспект по ул.Энгельса, а там нас уже ждали. Подогнали автобусы и загоняли туда молодежь. Низенький, толстенький майор милиции с красным лицом и седым ежиком на голове кричал: *"Мы вам говорили разойтись? Не разошлись — пеняйте на себя!"* Потом он бросился ко мне, схватил за руку и потащил к машине тоже с криком: *"Я ее видел! Она у них главная!"* Явно он меня с кем-то перепутал. Но сопротивляться я не стала, хотя не чувствовала за собой никакой вины. Думала: быстро разберутся, что я ни при делах, и отпустят домой. Но многие девчонки сопротивлялись. В результате одну девочку схватили за руки и за ноги и закинули в машину. Ей было 15 лет...

В автобусе мальчишки из соседних дворов предложили мне сбежать. Сказали: мол, ты же вообще не виновата, чего ты там будешь? То же предложение они повторили мне в отделении милиции возле кинотеатра "Победа", куда нас привезли. Мол, сделаем коридор и ты сбежишь, пока нас не разделили. Я отказалась. Чего это я побегу, если я вообще "ни сном ни духом"?

Продержали меня в отделении 6 часов. Без еды, без воды, без права позвонить родителям. А ведь мы, задержанные, были еще дети... Опросили-допросили и только поздним вечером позвонили мне домой, чтобы родители пришли за мной и забрали под расписку.

К этому моменту дома обзвонили уже все больницы и морги... Мама и сестра увязались за папой, потому что боялись, что на стрессе он устроит в милиции скандал. В результате при встрече мой почти двухметровый отец прямо в отделении вмазал мне так, что я улетела в угол и сползла по стенке. Сестра и мать бросились меня поднимать, и даже милиционер возмутился: *"Зачем вы так, гражданин? Она, может, ни в чем не виновата..."* На что папа, воспитанный в советских традициях, заявил: *"У нас в милицию невиноватых не забирают!"*

Назавтра были ласковые беседы и промывка мозгов в школе, шок присутствующих на школьном собрании, где я была в президиуме как член комитета комсомола, а меня оттуда громогласно пригласили в органы. Много чего было неприятного для школы.

Но наши мудрые учителя не сильно давили: никаких серьезных санкций не было, и я даже получила свою золотую медаль.

Правда, ровно через год, когда я уже училась в университете, часов в 12 дня, аккурат перед моими занятиями, к нам домой пришли двое в штатском и потребовали, чтобы я поехала с ними. Папа не хотел меня отдавать и тщательно проверил их документы. Меня, как преступницу, провели под конвоем через весь двор, держа с двух сторон под локти. То-то радовались наши дворовые кумушки! Потом на машине провезли до "самого высотного здания в Минске" (вы, конечно, знаете шутку про вид из окон его подвала на Сибирь?), хотя от моего двора ходу туда — 5 минут от силы. А вот там разговор был очень короткий: мол, мы знаем, что вы учитесь в университете. Если хотите и дальше там учиться, не ходите на годовщину известного события. И друзей попросите не ходить. Я еще раз терпеливо повторила, что я вообще ни при чем и не понимаю, чего от меня хотят.

Кстати, никто и не собирался отмечать годовщину. А я сильно рассердилась и в тот же день написала песню. Ее потом долго исполняли в городских дворах местные барды.

Названия города я не припомню, —
Подскажет, наверно, вам память сама...
Возможно, что в Гродно, а может, в Лукомле
Покончили с парнем по прозвищу Макс.
Известно любому: там рвется, где тонко.
И кровь оказалась краснее вина,
И вместо любимой до гроба девчонки
Над ним наклонилась сырая стена.
Подруга его скоро станет другим улыбаться,
А он никогда уж не встретит с любимой рассвет...
Тебе вот сейчас, ненадолго пускай, восемнадцать, —
Ему навсегда восемнадцать останется лет.
Мы знали его и пришли, чтоб проститься,
Мы в память его положили в том месте цветы.
Ты сам понимаешь: могло бы и так получиться,
Что вместо него оказался бы я или ты.
Названия города я не припомню, —
Подскажет, наверно, вам память сама...
Возможно, что в Гродно, а может, в Лукомле
Покончили с парнем по прозвищу Макс...

З НАТУРЫ

А потым стала зусім не смешна...

...Выйшла прагуляцца ля Камсамольскага возера, блізу якога жыву. Спынілася, кармлю бяздомнага сабачку. Да нас падышоў мужчына, сказаў, што шукае свайго чацвераногага сябра, які нядаўна згубіўся...

Ён звярнуўся да мяне па-рускі, я гэтак жа яму адказвала. Але на развітанне, калі пачула ад яго "Спасибо вам большое", у мяне звыкла зляцелі родныя словы, якімі думаю і звычайна размаўляю: "Калі ласка, няма за што..."

І тут мой субяседнік нібы аслупянеў, са здзіўленнем узіраючыся ў мяне:

— Дык вы — беларуска? І я таксама, што ж мы не па-нашаму размаўлялі? Давайце выправім памылку!

Ён увесь засвяціўся радасцю, і мне было прыемна, хоць разам з тым дзіўна і смешна: гэта ж трэба — беларус сустракае другога беларуса ў беларускай сталіцы, бы зняможаны падарожнік у пякельнай пустыні крыніцу з жывой вадой...

Але хутка перастала ўсміхацца, мяне агарнуў сум. Ці не самі ж мы, беларусы (а без мовы сваёй зусім і не беларусы, а безаблічныя абчэсаныя слупы) дапусцілі такое дзікунства, немагчымае больш нідзе на планеце? Нашу мову ўсялякія ўлады тапталі вякамі, і мы паступова змірыліся з гэтым, адступіліся ад найдарожшага духоўнага дару — мудрага, прыгожага матчынага і бацькоўскага слова. А разам з тым — і душу сваю губляем, яе багацце і прыгажосць. Губляем лёс сваіх дзяцей, Бацькаўшчыны. Няўжо не сорамна, няўжо не ачомаемся?

З павагай да вас, дарагія народавольцы, і прабачэннем за старэчы почырк (мне ўжо за 80) —

Тамара Канстанцінаўна ЛАЗАРУК,
мінчанка.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
20—22 КРАСАВІКА 2010 г.

...Правда никогда не умрет

Президент Польши Лех Качиньский и его супруга Мария похоронены в усыпальнице под Башней серебряных колоколов кафедрального собора краковской крепости Вавель. Богослужение в память о главе государства и первой леди прошло в Мариацком костеле, после этого гробы по улицам Кракова доставили к месту упокоения.

Богослужение транслировалось на всю страну. В Краков приехали сотни иностранных журналистов. Во многих городах Польши были поставлены большие мониторы, на которых можно было следить за тем, что происходило в Кракове. Такой же монитор силами польской диаспоры был поставлен в Лондоне, на Трафальгарской площади.

На поминальной мессе присутствовали президент РФ Дмитрий Медведев, президент Украины Виктор Янукович, президент Германии Хорст Келер, президент Чехии Вацлав Клаус, президент Литвы Даля Грибаускайте, премьер-министр Эстонии Андрус Ансип, бывший президент Украины Виктор Ющенко, бывший премьер-министр Украины Юлия Тимошенко. Позднее к ним присоединился президент Грузии Михаил Саакашвили.

Из-за вулканической пыли, нарушившей европейское авиасообщение, в Краков не смогли прилететь президент США Барак Обама, канцлер ФРГ Ангела Меркель, президент Франции Николя Саркози, президент Австрии Хайнц Фишер, премьер-министр Италии Сильвио Берлускони, принц Уэльский Чарльз, генсек НАТО Андрес Фог Расмуссен, президент ЕС Херман ван Ромпей, председатель Еврокомиссии Жозе Мануэль Баррозу — всего более 30 иностранных делегаций.

Выступая на церемонии, епископ Краковский, кардинал Станислав Дзивиш обратился к президенту РФ Дмитрию Медведеву со словами о том, что случившаяся 10 апреля трагедия поможет объединить два народа — российский и польский, которые "были разделены тем, что случилось в Катыни 70 лет назад".

В завершении траурного богослужения выступил и.о.президента Польши **Бронислав Коморовский**. Он, в частности, сказал: *"Президент уже не сможет призвать к тому, чтобы катынская рана зажила и перестала отравлять отношения между польским и российским народами, как он хотел это сделать 10 апреля в Катыни.*

Сегодня, частично благодаря второй драме в Катыни, мир говорит о Катыни... Правду можно спрятать, но она никогда не умрет. Мы верим, что мечты многих благородных россиян, в том числе членов "Мемориала", которых хотел наградить президент Качиньский в Катыни, исполнятся, что мы узнаем всю правду о Катыни. Надежду на это дают слова премьера Путина и присутствующего здесь президента Медведева, поступки, сочувствие многих россиян".

Комментаторы и политики отмечают, что тема российско-польских отношений в эти дни стала одной из главных и что трагедия рождает шанс на их улучшение.

ВЗГЛЯД

Из трагедии рождается надежда

Слово "Катынь" десятки лет символизировало для поляков неописуемое преступление и одновременно трагедию, а отныне оно будет ассоциироваться с еще одной национальной катастрофой, но, возможно, и с надеждой, пишет в статье для издания Time Збигнев Бжезинский. Перемены к лучшему в польско-российских отношениях будут означать воистину эпохальные геополитические перемены в Европе, отмечает ветеран американской политики.

За несколько дней до авиакатастрофы премьер-министры Польши и Российской Федерации Туск и Путин встретились, чтобы облечь в официальную форму осознание катыньского преступления. Путин выступил с речью. *"Он говорил хорошо, но все же скорее как государственный деятель, который делает то, что необходимо; он как-то не смог чисто по-человечески найти отклик в душах поляков"*, — пишет Бжезинский. Но после роковой авиакатастрофы Путин поехал на место трагедии и спонтанно выразил теплые чувства и сочувствия полякам, отмечает он.

Нельзя исключать, что в Польше всплывут конспирологические теории. Но, возможно, начнется новая эра в двусторонних отношениях, которая, на взгляд Бжезинского, поставит в более безопасное положение и других соседей России.

Бжезинский рекомендует не переоценивать последствия перемены настроения, но подчеркивает: *"В конечном итоге жизнь человечества предопределяется людьми. Чуткость, с которой российские лидеры отнеслись к трагедии, вкупе с решимостью польского руководства обойтись без встречных обвинений — это хороший знак"*. Автор надеется, что примирение поляков с русскими станет еще одной вехой общеевропейского примирения.

На юге Киргизии — протесты против временного правительства

На юге Киргизии в Джалал-Абаде более тысячи сторонников смещенного президента Курманбека Бакиева провели акцию протеста против временного правительства республики.

Как сообщает корреспондент Радио Свобода, протестующие требовали создания международной комиссии по расследованию гибели людей во время массовых волнений в Бишкеке. Они также настаивают на прекращении преследований семьи Бакиевых и восстановлении работы парламента. В понедельник стало известно, что новые власти Киргизии выделили около одного миллиона долларов для выплаты милиционерам, пострадавшим во время беспорядков в Бишкеке.

Обама не ответит

Президент Ирана Махмуд Ахмади Нежад направил письмо главе американской администрации Бараку Обаме. Это подтвердил официальный представитель Совета национальной безопасности (СНБ) при Белом доме Майк Хаммер.

Однако он отказался раскрывать содержание послания. "Мы не собираемся в этот раз вдаваться в детали относительно содержания корреспонденции", — сказал Хаммер. При этом он заметил, что американский лидер не намеревается отвечать на письмо Ахмади Нежада. "Мы не планируем отвечать на письмо, поскольку отвечать не на что", — добавил представитель СНБ, передает ИТАР-ТАСС.

Так, яны назаўжды застануцца ў маёй памяці. І не толькі ў маёй. Разам са мной да Барыса Кіта ў Франкфурт-на-Майне адправіліся яшчэ пяць беларусаў.

Прызнаюся, хваляваліся ўсю дарогу. А раптам... Чалавеку не пяцьдзесят і не семдзесят, а **ўсе 100!**

І якая радасць апанавала нас, калі мы ўбачылі перад сабой не нямоглага старца, а вясёлага, жыццярадаснага чалавека. Абдымкі, поціскі рук, першыя цёплыя словы... Я асабіста раней ні разу не сустракаўся з Барысам Уладзіміравічам, нашым славутым земляком, але, паверце, адчуванне было такое, быццам бы мы знаёмы даўным-даўно: ён вітаў кожнага з нас як блізкага, самага дарагога сябра. Такая ж сардэчнасць зыходзіла і ад яго вернай спадарожніцы Тамары. Здавалася, гэтых шчырых, лагоднаўсмешлівых людзей паслаў нам сам Бог!

У многіх нямецкіх рэстаранах няма гардэробаў, наведвальнікі вешаюць вопратку побач са сталамі на разгалінаваныя рожкі. Я, як маладзейшы за Барыса Уладзіміравіча на сорак гадоў, вырашыў дапамагчы яму зняць куртку. І трапіў у нялоўкую сітуацыю. "Дзякуй, дзякуй, я сам", — пачуў ветлівы адказ векавога Кіта. А каб згладзіць маю разгубленасць, Барыс Уладзіміравіч пажартаваў: "Калі хочаце, я магу паказаць вам позу чаплі?"

Такога я не мог уявіць сабе нават ува сне. Чалавеку **100**, а ён можа стаяць на адной назе, выцягнуўшыся ўсім целам наперад і шырока раскінуўшы рукі. "Штодзённая гімнастыка дапамагае, — заўважыўшы наша здзіўленне, удакладніў юбіляр. — Кожны дзень з Тамарай хвілін па трыццаць займаемся".

Вядома ж, такое незвычайна цёплае знаёмства з Барысам Уладзіміравічам нібы рукой зняло тое хваляванне, якое адольвала падчас пералёту з Мінска ў Франкфурт-на-Майне. Выбраўшы ўтульнае месца ў галоўнай зале рэстарана, мы ўсе размясціліся за адным доўгім сталом. Пакуль рассаджваліся, спадар Кіт некалькі разоў паўтарыў: "Як я цешуся, як я цешуся..." Пагадзіцеся, якое прыгожае слова — *цешуся*. Сёння ў Беларусі яго не часта пачуеш. Звычайна кажуць: радуюся. А Барыс Уладзіміравіч Кіт, з якім мы бачыліся два дні, ледзь не праз кожныя дзесяць хвілін прамаўляў: "Як я цешуся..." Гаварыў ён на чысцюткай беларускай мове. Як быццам не шэсцьдзесят шэсць гадоў таму пакінуў Бацькаўшчыну, родную Беларусь, а толькі ўчора ці ў крайнім выпадку пазалетась.

З аповедаў, якія некалі тут, у Франкфурце-на-Майне, запісаў Васіль Быкаў і якія "Народная Воля" друкавала ў шэрагу папярэдніх нумароў, вы, шаноўныя чытачы, ведаеце, якое нялёгкае, поўнае драматызму і выпрабаванняў, жыццё пражыў Барыс Уладзіміравіч Кіт. Таму, мяркую, няма сэнсу паўтараць радкі яго біяграфіі, лепш вернемся ў той гасцінны рэстаран, дзе мы аднымі з першых беларусаў віншавалі стогадовага юбіляра-земляка, чалавека, якога ведаюць ва ўсім свеце за яго глыбокі розум, за яго велізарны ўклад у сусветную навуку, за яго гуманістычную грамадзянскую пазіцыю. Па ўсім было бачна: Барыс Уладзіміравіч *цешыўся* кожнаму прывітанню, кожнаму слову, перададзенаму з Бацькаўшчыны. Вось ён трымае ў руках амаль трохкілаграмовы духмяны каравай "Радзівілаўскі", а ў вачах блішчаць, быццам ранішняя раса, слёзы. Слёзы радасці! Сувеніры з радзімы падрыхтавала не толькі наша кампанія. Арыгінальныя, з нацыянальным каларытам гасцінцы перадалі праз нас жонка Васіля Быкава — Ірына Міхайлаўна, літаратуразнаўца Лідзія Савік, прафесар Адам Мальдзіс.

Пасля афіцыйнай цырымоніі наступае момант падняць тост за Барыса Уладзіміравіча, да ста гадоў якому на той дзень не хапала менш тыдня. Я глянуў спачатку на спадарыню Тамару, потым на самога Кіта, пытаючыся: "Што будзем піць?" Па выразе твараў зразумеў: "Усё, што і госці". Заказалі чырвонае віно. Пад цікавую гутарку не заўважылі, як за першым келіхам апусцеў другі... Гэта ўжо назаўтра я спытаю ў Барыса Уладзіміравіча: "Як самаадчуванне?" І пачую: "Нармальнае". Аказваецца, спадар Кіт, пражыўшы сто гадоў, у жыцці ад нічога не адмаўляўся. Але і нічым не злоўжываў. Моцнымі спіртнымі напоямі не захапляўся, а вось ад келіха віна ці кофля піва не адмаўляўся. Як кажуць, не перабіраў і з харчамі. І гэта, мабыць, таму, што ў дзяцінстве зведаў голад. Каб неяк выжыць пасля рэвалюцыі 1917 года, бацькі вымушаны былі вярнуцца з Піцера ў вёску Агароднікі Карэліцкага раёна, што на Гродзеншчыне.

За сталом — восем чалавек. Гутарка не спыняецца ні на хвіліну. Мы, землякі Барыса Кіта, з цікавасцю ловім кожнае яго слова, кожны рух яго рук, кожную усмешку. Баімся стаміць яго сваімі пытаннямі, а ён, здаецца, толькі *цешыцца*, ад таго, што мы іх безупынна задаём, іншы раз не звяртаючы ўвагу на этыкет. Вось нехта зноў пацікавіўся здароўем Барыса Уладзіміравіча, маўляў, ці часта наведвае дактароў. Дзякуй Богу, у гэтым асаблівай патрэбы няма. Хоць яго малодшы сын адзін з самых вядомых лекараў у ЗША, па дапамогу да яго і да іншых дактароў спадар Кіт звяртаецца ў рэдкіх-рэдкіх выпадках. Калі ён вельмі гучна засмяяўся, я заўважыў: якія прыгожыя зубы! Няўжо свае? Пытацца ў самога юбіляра неяк няёмка, а таму, выкарыстаўшы момант, вырашылі паціка́віцца ў Тамары. І пачулі: "Усе зубы ў Барыса Уладзіміравіча свае, толькі на некалькіх стаяць каронкі". Во малайчына! Усім бы беларусам такія зубы!

І не толькі зубы. Моцнае ў спадара Кіта здароўе! Гляджу, пятая гадзіна пайшла, як мы сядзім за сталом. Я і мае малодшыя сябры ўжо не супраць таго, каб збегаць, прабачце, у туалет, а стогадовы Кіт бесперапынна працягвае расказваць пра жыццё-быццё, як быццам яго нішто не турбуе. І толькі спадарыня Тамара, прыкладна праз паўгадзіны, намёкам дае зразумець: можа, на сёння хопіць, заўтра ж зноў сустракаемся?

Дамаўляемся: інтэрв'ю, якое мы яшчэ ў Мінску вырашылі ўзяць у Барыса Уладзіміравіча не зусім звычайна, пераносім на наступны дзень. Я, праўда, пакуль не кажу, што пытанні будуць не толькі ад мяне, але і ад іншых журналістаў "Народнай Волі". Але што да гэтага Барысу Уладзіміравічу? Ён, мне падалося, настолькі рады прызямленню ў Франкфурце-на-Майне "беларускага дэсанта", што гатовы задаволіць любую нашу просьбу.

...У нядзелю сустракаемся ў тым жа рэстаране, што ў самым цэнтры нямецкай фінансавай сталіцы. Каб ніхто не перашкаджаў браць інтэрв'ю, я знайшоў ціхі куточак у другой зале. Вядома ж, першыя пытанні задаваў свае, прадуманыя яшчэ ў самалёце.

У першыя хвіліны знаёмства.

— З векавым юбілеем, Барыс Уладзіміравіч!

— Барыс Уладзіміравіч, на вашым жыццёвым шляху было столькі выпрабаванняў, столькі розных цяжкасцяў, што далёка не кожны вытрымаў бы. Вы не проста вытрымалі ўсе экзамены жыцця, але, як кажуць, узялі лёс у свае рукі. Як вам гэта ўдалося?

— Я лічу, усё залежыць ад людзей. Адны — рашучыя, другія — менш рашучыя, адны больш разумеюць, як ім дзейнічаць у той ці іншай складанай сітуацыі, другія менш. Ну я, можа, больш рашуча дзейнічаў, а калі казаць канкрэтна, заўсёды імкнуўся да лепшага, цікавейшага. Думаеце, лёгка было пакідаць Радзіму, падавацца на Захад? Але я прааналізаваў усе акалічнасці і прыйшоў да высновы: мне ў чарговы раз пагражае небяспека, а калі так, то я павінен ратавацца...

— Далейшы ваш лёс залежаў ад таго, якое рашэнне вы прымеце...

— Так. Некаторыя мае сябры казалі: што ты робіш, Барыс, куды едзеш, што цябе чакае? Ці варта зрушвацца з месца... Я цвёрда вырашыў: варта!

— Час паказаў, што вы тады прынялі адзіна правільнае рашэнне. А можаце, ужо з вышыні сённяшніх дзён, назваць некалькі сапраўды лёсавызначальных эпізодаў са свайго жыцця?

— Усе маладыя гады я прысвяціў асветніцтву. Нават падчас вайны вучыў дзяцей. Дык вось, калі ў Паставах узначальваў семінарыю, быў такі жудасны выпадак. Немцы правялі карную аперацыю, усеялі горад трупамі. Прыходзіць палкоўнік-германец і кажа: арганізуй семінарыстаў на ачыстку горада ад забітых. Я разумеў, чым гэта можа адгукнуцца ў будучым для мяне, а таму адмовіўся ад выканання такога даручэння. Тады немец выхоплівае пісталет і цэліцца ў мяне. Добра, што побач стаяў бургамістр, які схапіў яго за руку і папрасіў не пазбаўляць настаўніка жыцця, маўляў, пытанне будзе вырашана і без яго ўдзелу. Калі б бургамістр прамарудзіў нейкую секунду — мяне ў жывых не было б. У той жа час я не меў права запляміць сябе супрацоўніцтвам з немцамі.

— Падчас вайны яшчэ былі выпадкі, калі жыццё вісела на валаску?

— Калі б я не пакінуў Беларусь і не падаўся на Захад, са мною было б тое, што сталася з мільёнамі бязвінных савецкіх людзей. Хоць я, акрамя вучыцельства, нічым іншым не займаўся.

— А на Захад як прабіраліся?

— З прыгодамі. Даводзілася прымаць рызыкоўныя дзеянні. Калі я знаходзіўся ў Зальцбургу, Чырвоная Армія брала ўжо Вену, у якой засталіся мае рэчы. Я вырашыў падскочыць за імі. Прыехаў, а там ужо цягнікі не ходзяць. Трэба як-небудзь шмыгануць на Захад. Толькі мясцовы цягнік ішоў у Сант-Пэйтэн, гэта такая мясцовасць. Думаю, пад'еду хоць кіламетраў пятнаццаць, а там пайду пешшу.

— Змаглі усё ж такі вырвацца?

— Лёс спрыяў мне. Прыехаў я ў Сант-Пэйтэн, бачу, стаіць санітарны цягнік. У "гармоніку", які злучае вагоны, сядзяць людзі. Я заскочыў, праз нейкіх пару хвілін цягнік кануўся...

— За плячыма сто гадоў, поўны век. Што лічыце галоўным дасягненнем жыцця?

— Галоўнае дасягненне, лічу, звязана з тым перыядам, калі я працаваў у ракетнай галіне ЗША. Напачатку ў амерыканскай касманаўтыцы выкарыстоўваліся маламоцныя палівы, якія не дазвалялі значна прасунуцца наперад. Нарэшце навукоўцы звярнулі ўвагу на плыўкі вадарод. Аднойчы падыходзіць да мяне начальнік: "Барыс, падрыхтуй абагульняючы даклад па плыўкім вадародзе". Далі мне некалькі тыдняў, і я пачаў актыўна працаваць. У выніку напісаў вялікую працу, і гэта быў прарыў у маёй кар'еры. Плыўкі вадарод стаў асноўным ракетным палівам, дзякуючы яму амерыканцы змаглі паслаць карабель на Месяц, рэалізаваць праграму "Шатл" і многае іншае.

Я напісаў першы падручнік па ракетным паліве, якім дагэтуль карыстаюцца ў сусветных ракетных цэнтрах.

— Барыс Уладзіміравіч, а што засталося ў жыцці нерэалізаваным?

— У дзяцінстве я захапляўся ігрой на скрыпцы, маляваннем. Любіў гісторыю. Ледзь не паступіў на гістарычны факультэт Віленскага універсітэта, але ж у той год быў вялікі наплыў, і я пайшоў на матэматыку, што і вызначыла маё далейшае жыццё.

— Раскажыце, калі ласка, пра тое, як склаўся лёс вашых дзяцей?

— Скажу шчыра, я вельмі хачу, каб на Радзіме ведалі, што мой старэйшы сын Валодзя, які нарадзіўся ў 1941 годзе ў Лебедзеве пад Маладзечнам, быў адданым беларускім патрыётам. Ён цудоўна валодаў беларускай мовай, цікавіўся ўсім, што адбывалася на нашай Бацькаўшчыне. Займаў вялікую пасаду ў амерыканскім аэракасмічным агенцтве (NASA). На жаль, у мінулым годзе памёр. 4 лістапада нарадзіўся і 4 лістапада памёр. Я ўсім кажу: з ягонай смерцю напалову памёр і я.

Малодшы сын Віктар скончыў тры універсітэты, знакаміты ў Амерыцы хірург. Маю дзвюх унучак і двух праўнукаў. Старэйшая ўнучка Марына скончыла балетную школу ў Вашынгтоне. Выступала на адной сцэне з сусветна вядомым Рудольфам Нурыевым.

— Што вы ў людзях найбольш цэніце, найбольш паважаеце?

— Дабрыню. Добрыя, шчырыя сяброўскія адносіны. Не такія, што пагаварыў — і ўсё. Калі паміж людзьмі сапраўдная дружба, тады лягчэй жыць на свеце.

— Які, на ваш погляд, уклад жыцця найбольш спрыяльны для чалавека: заходні, ці, як мы кажам, наш, усходні, з адбіткам савецкай сістэмы?

— Дэмакратычны, сапраўды дэмакратычны, а не імітацыя пад дэмакратыю. Той, калі чалавек можа жыць так, як марыць, як хоча жыць. Я лічу, што ў Амерыцы найлепшая ў свеце сістэма дэмакратыі.

— Падсумоўваючы стогадовы жыццёвы шлях, вам можна толькі радавацца. Усявышні апекаваў вас, і таму вы прыйшлі да векавога юбілею ў добрым здароўі і радасным настроі...

— Дзякуй Усявышняму, дзякуй лёсу, што кіраваў мною і даваў магчымасць вытрываць усе выпрабаванні!

— Наступнае пытанне, магчыма, не зусім карэктнае. Вы, Барыс Уладзіміравіч, самі вырашайце, адказваць на яго ці не. Можна і не адказваць, і наогул парайце мне, уключаць яго ў інтэрв'ю ці не ўключаць. Але я, як ваш суайчыннік, як чалавек, які блізкі вам па духу, хацеў бы высветліць вось такое пытанне. Бессмяротных людзей не бывае, наступіць такі час, калі трэба будзе і вам, Барыс Уладзіміравіч, павітацца за ручку з Богам, а ён вам, я ўпэўнены, дазволіць гэта зрабіць. Але ж да нас, вашых землякоў, дайшла інфармацыя, што вы ўжо купілі месца тут, у Нямеччыне, для свайго пахавання. А не думалі наконт таго, каб вярнуцца на Бацькаўшчыну?

— Я, безумоўна, думаў. Але для вас гэта такая цяжкасць будзе... Я не рашыўся на вашы плечы накладваць такія абавязкі. Тут ёсць Вісбадэн, там ужо ляжаць беларусы, архіепіскап Філафей...

— Вы будзеце сярод супляменнікаў, родзічаў?

— Так. Гэта першае. Там цудоўныя могілкі, на якіх пахавана нямала выдатных людзей, не толькі многіх расійцаў, але і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. Ну і самае важнае: тут, у Нямеччыне, на іншых могілках 20—30 гадоў хаваюць, а потым наверх кладуць другіх, трэціх... Знікае чалавек. А вось гэтыя могілкі застаюцца назаўсёды...

— Ну тады зусім шчыра... Я толькі баюся, каб вас не пакрыўдзіць. Але, скажыце, калі беларуская гісторыя захоча, можа, праз 50 гадоў, можа, праз 100, вярнуць вас на Радзіму, вы не супраць даць згоду на гэта сёння?

— Згода. Добра.

Я звяртаюся да сябра, які запісваў гэтыя словы на лічбавую відэакамеру:

— Гэта гістарычны момант. Запішы: калі Беларусь захоча вярнуць свайго знакамітага сына дахаты, на Радзіму, ён сёння, адзначаючы сваё 100-годдзе, гаворыць, што дае на гэта згоду.

Барыс Уладзіміравіч працягвае роздум:

— Добра. Тое, што вы мне гаворыце, я чую ўпершыню. Але гэта робяць усе народы.

— Так. Значыць, я не пакрыўдзіў вас гэтым пытаннем?

— Барані Божа. Беларусь — заўсёды мая Бацькаўшчына.

— А зараз, Барыс Уладзіміравіч, дазвольце перайсці да пытанняў, якія я прывёз для вас ад журналістаў "Народнай Волі". Святлана Калінкіна, напрыклад, просіць, каб вы адказалі на такое пытанне. У Беларусі вы працавалі дырэктарам гімназіі, настаўнікам, школьным інспектарам, а каб сёння вярнуцца ў тыя гады, ад якіх памылак вы ў першую чаргу перасцераглі б сваіх вучняў? Які галоўны ўрок дало вам жыццё?

— Шчыра кажучы, ёсць вучні якія радуюць і сваіх настаўнікаў, і сваіх бацькоў, а ёсць такія, якія, на жаль, не хочуць вучыцца. А ў жыцці самае галоўнае — гэта веды. Як кажуць, трэба вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца! Нельга марнаваць час на ўсялякія гулянкі-п'янкі, іншыя ганебныя рэчы. Адным словам, мая парада: самае дарагое — гэта час, не губляйце яго дарэмна.

— А які галоўны ўрок усё ж такі дало вам жыццё?

— Быць добрым чалавекам. Нікому шкоды не рабіць. Мець чыстае сумленне. Я ніколі нікому не стараўся зрабіць дрэнна, толькі наадварот. Адным словам, трэба быць добрым для ўсіх...

— Барыс Уладзіміравіч, вось пытанне ад Марыі Эйсмант. За часы праўлення Лукашэнкі шмат маладых перспектыўных людзей пакінулі Беларусь. Як вы ставіцеся да іх рашэння будаваць сваё будучае па-за межамі Радзімы? Ці можна іх асуджаць, папракаць тым, што нельга будаваць дэмакратыю на сваёй радзіме, знаходзячыся за тысячы кіламетраў ад яе?

— Вандруючы па свеце, я пазнаёміўся з мноствам вялікіх людзей, якія дапамагалі сваёй Бацькаўшчыне лепш, чым некаторыя з тых, хто пражываў на месцы.

Вось і я. З'ехаў у Амерыку, але ні на адзін дзень не забываў і не забываю пра Радзіму.

— Што б вы маглі параіць маладым беларусам, якія ўсё ж такі ў сённяшніх умовах пакідаюць Беларусь...

— Пакідаць, калі ўзнікае такая неабходнасць, часова, а не назаўсёды. І дапамагаць Бацькаўшчыне ўсім, чым толькі можна.

— І яшчэ пытанне ад Марыі Эйсмант. Ці цікава, Барыс Уладзіміравіч, жыць у такім узросце, якога дасягнулі вы?

— Як для каго. Праўда, трэба прызнаць, што калі чалавек старэе, з'яўляецца нейкая апатыя, але гэта залежыць ад таго, як хто ставіцца да жыцця. Я яшчэ вельмі за ўсё перажываю, усім цікаўлюся, таму не згубіў прагу да жыцця.

— Зараз я зачытаю пытанні Марыны Коктыш. Першае — як вы спраўляецеся са стрэсамі?

— Стараюся пераключацца на нейкую іншую тэму, не ўзгадваць тое, што сапсавала настрой. Не трэба забіваць сябе дрэннымі думкамі... Больш увагі звяртаць на галоўнае і менш — на другаснае.

— Тая ж Марына Коктыш прасіла мяне задаць такое далікатнае пытанне: для вас тэма любові, кахання заўжды была актуальна?

— Як тут адказаць... Калі мець на ўвазе чыста фізіялагічны бок, то з узростам актуальнасць гэтай тэмы, безумоўна, зніжаецца, але набывае большае значэнне фактар маральнасці, прыгажосці ў адносінах паміж мужчынам і жанчынай.

— Ці былі ў вас учынкі ў адносінах да жанчын, за якія потым было сорамна?

— Не было. Я заўсёды шкадаваў сваіх прыхільніц і стараўся да апошняга быць з імі.

— Малады журналіст Віталь Гарбузаў пытаецца, што, на вашу думку, павінны зрабіць беларусы, каб стаць сапраўды свабоднымі людзьмі на сваёй зямлі?

— Пабудаваць сапраўды дэмакратычную дзяржаву. Улады не павінны кідаць людзей у турмы за іх погляды. І яны, улады, павінны разумець, што яны не вечныя...

— Пытанне Івана Макаловіча: чаму Беларусі так рэдка шанцавала на лідэраў?

— Я так не казаў бы. Лічу, што за сваю гісторыю Беларусь мела нямала выдатнейшых лідэраў. Я добра ведаў, напрыклад, Бранеслава Тарашкевіча. Ён быў вялікім чалавекам!

— Алена Малочка прасіла спытаць у вас, ці даводзілася вам сустракацца з публіцыстам, гісторыкам, дзеячам старой рускай міграцыі Глебам Рарам?

— Не даводзілася.

— Яшчэ адно яе пытанне. Як вы думаеце, ці хутка наша грамадства пазбавіцца ад жорсткіх ідэалагем, ад вечнага падзелу людзей на "сваіх" і "чужых"?

— Мяркую, што не хутка. Трэба спачатку змяніць сістэму, у якой жыве грамадства, надаць ёй сапраўды дэмакратычную аснову.

— Вашы пажаданні беларусам, сваім суайчыннікам — тым, якія жывуць на Бацькаўшчыне, і тым, якія жывуць за яе межамі: Што б вы сёння маглі ўсім нам пажадаць?

— Каб усе былі шчаслівыя. Свабода, дэмакратыя — лепшы лад жыцця. Каб усё гэта было ў беларусаў, якія жывуць на Бацькаўшчыне.

...Два дні доўжылася наша сустрэча ў Франкфурце-на-Майне са слынным сынам Беларусі Барысам Уладзіміравічам Кітом. Час праляцеў, як адна хвіліна. Ужо ў самалёце я міжволі падумаў: добра было б, каб ён у такім веснавым настроі сустракаў і наступныя свае юбілеі — у 105, 110 і нават у 120 гадоў.

Доўгіх і радасных дзён вам, Барыс Уладзіміравіч!

Іосіф СЯРЭДЗІЧ.

Мінск—Франкфурт-на-Майне—Мінск.

www.kamunikat.org

Народная Воля
http://www.nv-online.info
20—22 КРАСАВІКА 2010 г.

ПАСЛЯСЛОЎЕ

Аляксандр ГАНЧАРОЎ:

«Калі не паважаеце балельшчыкаў, дык падумайце хаця б пра імідж краіны...»

Днямі ў Мінску завяршыўся чэмпіянат Еўропы па цяжкай атлетыцы, дзе беларусы заваявалі аж восем медалёў — 3 залатыя і 5 бронзавых. Галоўны трэнер зборнай Беларусі Аляксандр ГАНЧАРОЎ задаволены выступленнем каманды, але кажа, што былі і "моманты смутку".

"Мяне вельмі засмуціла траўма Генадзя Махвяені, — прызнаўся Аляксандр Васільевіч ej.by. *— Шкада нават не тое, што ён мог заваяваць бронзавы медаль, а па-чалавечы шкада спартсмена. Ён атрымаў сур'ёзную траўму плечавога сустава, і што будзе далей — не вядома. Прыкра, што і Мікалай Новікаў з-за траўмы калена не стаў першым, хоць проста абавязаны быў гэта зрабіць".*

Па словах Аляксандра Ганчарова, пасля чэмпіянату будуць зроблены пэўныя карэктывы ў рабоце.

"Ведаеце, той, хто нешта шукае новае, заўсёды зробіць урокі і з няўдалага выступлення, і з пасхаваага выступлення, — кажа ён. *— Сёння відавочна, што трэба ўдасканальваць фармакалогію. Траўмы, якія здарыліся з нашымі спартсменамі, таксама даюць нагоды для роздуму. Напэўна, і мне трэба звярнуць увагу дактароў, каб больш прадуктыўна працавалі з кожным атлетам. Думаю, што да чэмпіянату свету будуць зроблены пэўныя высновы".*

— А хто вас больш за ўсіх парадаваў?

— Усе, не хацеў бы вылучаць кагосьці аднаго. Нават дзяўчына, якая заняла 10-е месца, таксама ў нейкім сэнсе пераможца. Таму што ўсе рабілі агульную справу, і як вынік — першае каманднае месца ў мужчын, і трэцяе — у жанчын. Пры гэтым беларуская жаночая зборная паказала такі вынік упершыню ў сваёй гісторыі! А ўвогуле, чэмпіянат паказаў, што мы рухаемся ў правільным накірунку.

— Але алімпійскі чэмпіён Андрэй Арамнаў так і не парадаваў беларускіх балельшчыкаў новым рэкордам...

— Так, але ж сусветны рэкорд — гэта не новая цацка, якую можна набыць, як толькі гэтага захацеў. На цяперашні момант Андрэй не быў падрыхтаваны да таго, каб паставіць рэкорд. Аб гэтым трэба сказаць шчыра. А аднаго жадання ў такім выпадку мала. За тыдзень да выступлення на еўрапейскім першынстве ў Арамнава былі 6 кілаграмаў залішняй вагі. І, калі штучна зганяеш кілаграмы, сілавыя якасці пагаршаюцца.

— Што скажаце пра арганізацыю турніру?

— Я бачыў спаборніцтвы суперкласа, як гэта было на апошнім чэмпіянаце свету ў Паўднёвай Карэі. Але даводзілася назіраць і такія слабыя турніры, што мінскі ў параўнанні з імі — што неба і зямля. І спартсмены, і трэнеры — усе адзначылі высокі ўзровень першынства ў Мінску. Таму не здзіўлюся, калі нашай сталіцы давераць у хуткім часе правядзенне і чэмпіянату свету.

— Чэмпіянат Еўропы роднае тэлебачанне паказвала ў асноўным ў запісе позна вечарам. Не сорамна вам было за такую работу тэлевізіёншчыкаў?

— А я пра гэта сказаў на Алімпійскім сходзе, пасля чаго адразу ж былі прыняты меры. І перамогу Андрэя Арамнава балельшчыкі змаглі паглядзець ужо ў прамым эфіры. Але ж гэта і на самай справе сорам, калі турнір такога ўзроўню праходзіць у Мінску, а людзі павінны назіраць за спаборніцтвамі па тэлевізары ноччу. Калі вы не паважаеце балельшчыкаў, то падумайце хаця б пра імідж краіны.



Падрыхтаваў Алесь СВЯТЛАНІЧ.

МАЗАІКА

Adidas чакае адказу

Міністр спорту і турызму Алег Качан даручыў прапрацаваць пытанне аб магчымасці адкрыцця афіцыйнага прадстаўніцтва Adidas у Беларусі, паведаміла прэс-служба Мінспорту паводле вынікаў сустрэчы з генеральным дырэктарам кампаніі па Расіі і краінах СНД Марцінам Шэнкландам.

Кампанія Adidas звярнулася ў спартыўнае ведамства з пытаннем аб магчымасці адкрыцця ў Беларусі афіцыйнага прадстаўніцтва, адзначаецца ў паведамленні. На думку кіраўніцтва кампаніі, гэты крок *"дазволіў бы зрабіць таннейшымі для беларускага спажыўца спартыўныя тавары і даў бы гарантыю высокай якасці прадукцыі".*

Шэнкланд паведаміў, што ў выпадку адкрыцця афіцыйнага прадстаўніцтва будзе створана шырокая сетка магазінаў па продажы тавараў фірмы Adidas, цытуе БелаПАН.

Качан *"даручыў прысутным кіраўнікам структурных падраздзяленняў Мінспорту прапрацаваць пытанне магчымасці адкрыцця афіцыйнага прадстаўніцтва ў цесным кантакце з прадстаўнікамі кампаніі". "Перш за ўсё павінны быць захаваны інтарэсы дзяржавы",* — заявіў міністр.

Зубром не задаволены?

Генеральны дырэктар мінскага хакейнага "Дынама" Сяргей Каткоў заявіў, што клуб можа вярнуцца да класічнага лагатыпа з выявай літары "Д".

"Дзіўна, што лагатып з 85-гадовай гісторыяй замянілі на выяву зубра. Я разумею, што гэта практычна сімвал Беларусі, але нават у Латвіі пакінулі літару "Д" у лагатыпе. Я ўжо папрасіў кампанію "Луч" даслаць нам альтэрнатыўны лагатып, дзе была б і літара "Д", і зубр. Да слова, Юрый Бародзіч даў папярэднюю згоду на вяртанне да класічнага варыянта", — адзначыў Каткоў.

Ён таксама дадаў, што маладзёжны склад мінскага "Дынама" хутчэй за ўсё будзе насіць назву "Мінскія зубры".

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

«При наличии такой массы недостатков "Динамо" очень сложно было решить задачу выхода в плей-офф...»

Как известно, в хоккейном минском "Динамо" произошло обновление, как говорят, руководящего состава. Новый генеральный директор клуба россиянин Сергей КАТКОВ (на фото — слева) и новый главный тренер чех Марек СИКОРА рассказали в конце прошлой недели журналистам, какие планы у них на этот сезон.

Сергей Катков: — Что уже удалось сделать? Первое. Мы пригласили главного тренера, имеющего за плечами богатый опыт работы на разных уровнях — начиная от юношеских и юниорских команд и заканчивая командами КХЛ, — цитирует "Салідарнасць". — Помощниками Марека Сикоры в должности старших тренеров будут два известных специалиста — Александр Леонидович Андриевский и Анатолий Николаевич Чистяков. Последнего пригласили по просьбе и рекомендации пана Сикоры, который с ним работал три года в магнитогорском "Металлурге" и "Автомобилисте" из Екатеринбурга. Чистяков был ассистентом Сикоры. Второе. Продолжается работа по комплектованию команды на следующий сезон. Вскоре после приезда в Минск я побеседовал со всеми без исключения игроками "Динамо", защищавших цвета клуба в минувшем регулярном чемпионате КХЛ. Я всем задавал примерно одни и те же вопросы, чтобы понять и сделать вывод, какие причины помешали команде выйти в плей-офф. Разговор со всеми ребятами получился откровенным. И я им за это благодарен. Игроками было высказано много замечаний. На основании чего я сделал вывод: при наличии такой массы недостатков очень сложно было решить задачу выхода в плей-офф...

— Не планируете ли вы вернуть белорусских игроков, выступающих в других КХЛовских клубах, в "Динамо"?

— Еще до появления здесь пана Сикоры я посчитал для себя нужным попытаться вернуть конкурентоспособных по меркам КХЛ ребят в "Динамо". Это — Угаров, Калюжный, Кольцов, Демагин. С каждым из них я поговорил. От одних получил конкретный отказ, другие сказали, что, в принципе, готовы. Но кто-то, как, например, Кольцов, связан контрактом... Демагин думает. Калюжный? Я переговорил с президентом московского "Динамо" Головковым, он сказал: "У нас с ним закончился контракт, можете с ним работать". Я сразу позвонил Калюжному, Леша мне ответил: "Почему нет?" А на следующий день позвонил его агент, говорит: "Мы будем думать, нам в другой команде дают в два раза больше денег..." Понимаете? Это все непростой вопрос. Я также хотел бы иметь в команде Сергея Костицына. Я договорился с его агентом, что если "Монреаль" не предложит ему односторонний контракт, то он готов рассмотреть наше предложение. Так что в этом направлении работа ведется... Сегодня, в принципе, завершен подготовительный сезон — мы с Мареком Сикорой обговорили все вопросы. 1 июля начнет подготовку наша молодежная дружина, а 15-го — первая команда.

— Каков бюджет клуба на следующий сезон?

— Надеюсь, бюджет будет достаточным, чтобы решить задачу.

— Больше или меньше, чем в прошедшем сезоне?

— Еще раз говорю: будем надеяться, что бюджет позволит нам решить задачу. А порядок цифр... Зачем это вам нужно? Вы же не в команде все равно.

— Пан Сикора, какой вы видите в идеале команду на старте регулярного чемпионата КХЛ?

Марек Сикора: — У меня есть мысль поддержать белорусских игроков. Но это пока мысль: я, к сожалению, еще мало знаю возможности белорусских хоккеистов — в прошлом сезоне "Автомобилист" встречался с "Динамо" всего два раза. Да и то: тренер всегда следит за своими игроками, а не за игроками соперника. Поэтому я хочу посмотреть матчи сборной, чтобы быть в курсе, какими качествами обладают хоккеисты. Что касается непосредственно игры, то хочу, чтобы "Динамо" играло в современный хоккей. Мы постараемся играть по ситуации. Читать игру. Не хочу сказать, что мы будем действовать в откат, но я тот тренер, который на первое место ставит игру в обороне. Оборона — это результат. Уверен, если хорошо будем действовать в обороне, то без проблем выйдем в плей-офф. Хорошей физической подготовки вкупе с организацией и дисциплиной игры хватит для достижения результата. Будем стараться играть по ситуации. Если есть возможность, будем давить, прессинговать в чужой зоне. Если такой возможности нет — откатываемся и делаем ставку на стремительные контратаки. Это для меня современный хоккей.

— Пан Сикора, вы уже успели разобраться, почему минское "Динамо", обладающее хорошими условиями, второй год подряд не может пробиться в плей-офф? В чем корень проблемы?

М.С.: — У меня на это еще не было достаточно времени. Условия в Минске действительно классные: организация дел в "Динамо" намного лучше, чем, например, в Екатеринбурге. Но, думаю, что главный вопрос — создать коллектив единомышленников. Для меня эта задача первостепенная.

— А что вы подразумеваете под сплочением коллектива? Понятно, что канадцы будут общаться преимущественно с канадцами, финны с финнами...

М.С.: — Финнов не будет. А с канадцами постараюсь найти общий язык... Понимаете, для меня лишь недавно закончился сезон. А я не привык заниматься хоккеем в конце апреля — начале мая: в это время я привык отдыхать после напряженного сезона. Поэтому сейчас я не задаюсь вопросом, как создать в Минске коллектив, — для этого будет время, когда начну работать непосредственно с командой. У меня есть мысли на этот счет, но пока, извините, не буду ничего говорить. И прежде всего потому, что мой русский не достаточно хорош, чтобы точно донести до вас то, что я хочу сделать в этом плане.

— Поделитесь впечатлениями о первой неделе пребывания в Минске.

М.С.: — Минск — красивый город. Стоит хорошая погода: наступила весна. У меня квартира, от которой, как я и хотел, 20—25 минут пешком до арены. Продукты посмотрел. Хорошие. "Минск-Арену" посмотрел и начал сотрудничать с генеральным директором по всем тем вопросам, которые он озвучил. Я надеюсь, что буду сотрудничать с вами, журналистами, весь сезон. Ведь, насколько я в курсе, за два года в минском "Динамо" сменилось пять главных тренеров... Хочется верить, со мной получится лучше.

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

Валуеў супраць кубінца?

Прамоўтэры расійскага баксёра-цяжкавагавіка Мікалая Валуева і кубінца Одланьера Соліса пачалі перамовы аб правядзенні бою. Аб гэтым паведамляе інтэрнет-выданне FanHouse.com.



Калі бакі дамовяцца аб арганізацыі паядынку, яго пераможца стане абавязковым прэтэндэнтам на тытул чэмпіёна свету па версіі WBC, які належыць украінцу Віталію Клічко.

Па рашэнні WBC, прамоўтэры баксёраў у тэрмін да 30 красавіка 2010 года могуць дамовіцца аб умовах правядзення паядынку ў двухбаковым парадку. Калі дамоўленасць не будзе дасягнута, WBC прызначыць таргі на права арганізацыі бою.

29-гадовы Соліс, які ў 2004 годзе стаў чэмпіёнам Алімпійскіх гульняў у Афінах, у 16 баях на прафесійным рынгу атрымаў 15 перамог. Свой апошні паядынак кубінец правёў у сакавіку 2010 года з 35-гадовым Карлам Дэвісам Драмондам з Коста-Рыкі. Соліс перамог накаўтам у трэцім раундзе.

36-гадовы Валуеў за сваю кар'еру атрымаў 50 перамог (34 — накаўтам) і пацярпеў два паражэнні.

КРЫЖАВАНКА

Барысу Кіту — 100 гадоў

Па гарызанталі: 1.Імя Семяновіча, першага ракетчыка Еўропы, вынаходніка шматступенчатай ракеты, ураджэнца Віцебшчыны. Сёлета — 410 гадоў з дня яго нараджэння. 4. ... часу. Герметычна закрытае ёмішча з біяграфіямі славутых вучоных свету, у тым ліку і нашага суайчынніка Барыса Кіта, якое знаходзіцца ў Вашынгтоне і будзе адкрыта праз 500 гадоў. 8.Марцін ... — прозвішча амерыканскага вучонага-фізіка, лаўрэата Нобелеўскай прэміі, бацька якога — ураджэнец г.Пружаны. 9.Сталіца еўрапейскай краіны, заснаваная вікінгам Харальдам, жонка якога — каралева Лізавета, унучка Полацкай княгіні Рагнеды. 11.Вёска на Маладзечаншчыне, дзе настаўнічаў Барыс Кіт і адкуль родам яго жонка Ніна Корсак. 14.Культурна-асветніцкая ўстанова ў Навагрудку, дзе існуе асобны пакой, прысвечаны Барысу Кіту. 15.Дыпламатычны прадстаўнік; імі былі ад Беларусі ў Германіі Пётра Садоўскі і Пётр Краўчанка, якія падтрымлівалі добрыя адносіны з нашым славутым земляком. 16.Паветраны шар для метэаралагічных назіранняў. 17."Цярновы ..." — аповеды аб сваім жыцці Барыса Кіта, запісаныя Народным пісьменнікам Беларусі Васілём Быкавым. 20.Гістарычна ўстойлівая супольнасць людзей. 21."Як не сягне высока птах// Ляцеціма ў гняздо наніз// Зямля стаіць на трох кітах,//Адзін з кітоў — Спадар ..." (чатырохрадкоўе народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна з яго кнігі "Дуліна ад Барадуліна"). 26.Верш паэтэсы Вольгі Іпатавай, прысвечаны Барысу Кіту ("Доктар Кіт запальвае свечку ў Майніцкім саборы"). 28. ... Мацяш — беларуская паэтэса, якая сустракалася з Барысам Кітом і падарыла яму свае зборнікі вершаў. 29.Планета, пра якую распавёў Барыс Кіт студэнтам падчас наведвання Гродзенскага універсітэта, дзе ён быў абраны ганаровым прафесарам. 30.Паселішча выхадцаў, перасяленцаў з Беларусі, якое стварылася ў г.Саўт-Рывер (ЗША) дзякуючы намаганням Барыса Кіта. 31.Турма ў Вільні, куды за беларускасць польскія ўлады зняволілі Барыса Кіта і дзе ён сустрэў Рыгора Шырму і Браніслава Тарашкевіча.

Па вертыкалі: 2.Тое, што і біяполе. 3. ... Сяднёў — імя беларускага паэта (жыў і памёр у ЗША), з якім сябраваў Барыс Кіт і якому дапамог выдаць кнігу "Раман Корзюк". 5.Адна з дысцыплін, якая выкладалася ў Маладзечанскім Адміністрацыйна-гандлёвым інстытуце, дзе дырэктарам быў Барыс Кіт. 6.Пісьмо. 7.Народны сход; савет прадстаўнікоў. 8.Грашовае заахвочванне, якім Барыс Кіт падтрымлівае выдатных таленавітых людзей Беларусі. 10.Амерыканская праграма палёту людзей на Месяц, у паспяховым выкананні якой вялікая заслуга акадэміка, прафесара, доктара філасофскіх навук Барыса Кіта. 12.Адна з сярэдніх навучальных устаноў, якія былі адкрытыя дзякуючы Барысу Кіту ў Маладзечне і Паставах і навучэнцы якіх не былі ўгнаныя ў рабства ў Германію. 13.Уладзімір ... — савецкі касманаўт, ураджэнец Беларусі; з ім і Пятром Клімуком быў асабіста знаёмы Барыс Кіт. 18.Горад у Германіі, дзе Б.Кіт вывучаў медыцыну ва універсітэце (1945—1948 гг.). 19."... беларуса" — кніга пісьменніцы, навукоўца Лідзіі Савік, якую яна, як і кнігу "Вяртанне", прысвяціла жыццёваму і творчаму шляху выдатнага вучонага. 22. ... Клуг — імя англійскага вучонага-хіміка, лаўрэата Нобелеўскай прэміі, ураджэнца г.Зэльвы. 23.Міжнародная акадэмія навукі і культуры Еўразіі (абрэв.); віцэ-прэзідэнтам яе з'яўляецца Барыс Кіт. 24.Галіна навукі, у якой Барыс Кіт працаваў у першыя гады жыцця ў ЗША. 25. ... Далідовіч — імя таленавітага педагога, выкладчыка беларускай літаратуры ў Маладзечанскім Адміністрацыйна-гандлёвым інстытуце. 27.Сукупнасць транспартных сродкаў.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.
г.Дзяржынск.



АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ

Па гарызанталі: 1.Казімір. 4.Канцлера. 8.Перн. 9.Осла. 11.Лебедзева. 14.Музей. 15.Пасол. 16.Зона. 17.Шлях. 20.Нацыя. 21.Барыс. 26."Настаўнік". 28.Ніна. 29.Марс. 30.Казонія. 31.Лукішкі.

Па вертыкалі: 2.Аўра. 3.Мосей. 5.Права. 6.Ліст. 7.Рада. 8.Прэмія. 10."Аналон". 12.Семінарыя. 13.Кавалёнак. 18.Мюнхен. 19.Космас. 22.Аарон. 23.МАНЕ. 24.Хімія. 25.Янка. 27.Парк.

Піяр-клуб

Футбольны каментатар Васіль Уткін адмовіўся ад удзелу ў рэкламе футбольнага клуба "Жамчужына-Сочы". Аб гэтым Уткін напісаў у сваім блогу ў інтэрнет-выданні Sports.ru.

Па словах Уткіна, удзельнічаць у рэкламнай кампаніі клуба прапанавалі Гуусу Хідзінку, Ксенні Сабчак і яму. Усе ўдзельнікі павінны былі з'явіцца на білбордах, якія планавалася размясціць на Рублёва-Успенскім шасэ і Разанскім праспекце.

Пры гэтым на рэкламным шчыце з выявай Хідзінка павінны былі з'явіцца словы "Я веру ў іх", Сабчак — "Я закахана", Уткіна — "Я раскажу аб іх у эфіры".

Уткін палічыў, што прапанову можа прыняць толькі Сабчак, якая не мае адносін да футболу. Для футбольнага ж каментатара, які адпрацаваў у гэтай галіне 16 гадоў, "абяцаць расказваць аб нечым у эфіры абсурдна", адзначыў Уткін.

Нагадаем, што ў лютым 2010 года ў Маскве з'явілася на вуліцы рэклама футбольнага клуба "Жамчужына-Сочы", на якой была выява англійскага паўбаронцы Дэвіда Бэкхема. На банеры быў подпіс: "Мы адмовіліся ад яго". Тады прадстаўніцтва клуба заявіла, што не мае дачынення да з'яўлення плакатаў на Разанскім праспекце.

Падрыхтаваў Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Да чэмпіянату не дажыў

64-гадовы жыхар ПАР памёр у чарзе за білетамі на матчы чэмпіянату свету па футболе, які пройдзе ў гэтай краіне з 11 чэрвеня па 11 ліпеня, паведамляе Reuters. Урачы лічаць, што мужчына памёр з-за сардэчнага прыступу. У чарзе за білетамі памерлы балельшчык быў 565-м.

Свабодны продаж білетаў на матчы чэмпіянату свету-2010 пачаўся ў ПАР напрыканцы мінулага тыдня. Аднак балельшчыкі пачалі займаць чэргі яшчэ раней. Так было і ў Кейптаўне, дзе адбыўся няшчасны выпадак з 64-гадовым мужчынам. Усяго ў рознічны продаж паступіла 500 тысяч білетаў.

Па словах аднаго з балельшчыкаў, у апошні раз ён бачыў у ПАР такія чэргі, калі галасаваў за Нельсана Мандэлу.

Першапачаткова ФІФА не планавала рознічны продаж білетаў у ПАР, разлічваючы прадаць іх праз інтэрнет. Аднак многія жыхары ПАР не маюць доступу да інтэрнета, у сувязі з чым кіраўніцтва ФІФА вырашыла арганізаваць продаж білетаў у футбольных касах і супермаркетах.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск,
вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная:
тэл./факс
(017) 3286871.
Тэл./факс
рэкламнага
аддзела: (017)
3286904, 3286906
E-mail :
nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

ISSN 2071-9647

Падпісныя індэксы: 63222,632222

Заснавальнік
і галоўны рэдактар
Іосіф Паўлавіч
СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродка масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 19.04.2010 у 18.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 21140 экз. Заказ №1876.